З. Сярмед…

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ПРАГРАМЫ
## ДЛЯ СЯРЭДНІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

## ГІСТОРЫЯ

*Адобраны*
*Міністэрствам адукацыі і навукі*
*Рэспублікі Беларусь*

Curricula für X.–XI. Klassen der allgemein= bildenden Schulen, Berufs= und Fachschulen

МІНСК
НМЦэнтр
1995

Minsk, 1995

Georg-Eckert-Institut
für internationale
Schulbuchforschung
Braunschweig
-Schulbuchbibliothek-
98/810

BY
2-2
(1,95)

ББК 63.3(073.3)
П51
УДК 93(073.3)

Складальнікі:

Па сусветнай гісторыі: І. В. Аржахоўскі, Н. М. Ганушчанка, Г. І. Даўгяла, Г. А. Космач, У. С. Кошалеў, П. Р. Лук'янаў, У. В. Тугай, В. А. Фядосік, В. І. Ханкевіч, А. А. Яноўскі.

Пад навуковай рэдакцыяй У. С. Кошалева

Па гісторыі Беларусі: М. В. Біч, Н. М. Ганушчанка, П. А. Лойка, У. Н. Сідарцоў, Г. В. Штыхаў, В. М. Фамін.

Пад навуковай рэдакцыяй М. В. Біча

© Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, 1995

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У адпаведнасці з новай канцэпцыяй гістарычнай адукацыі ў X-XI класах агульнаадукацыйных школ, прафесіянальна-тэхнічных вучылішчах і сярэдніх спецыяльных навучальных установах у групах з атрыманнем сярэдняй адукацыі прадугледжваецца вывучэнне сусветнай і айчыннай гісторыі на больш высокім праблемна-тэарэтычным узроўні.

Праграмы разлічаны на вывучэнне гісторыі ў аб'ёме 6 гадзін у тыдзень, 204 гадзін у год.

Структура курсаў:

X клас. Сусветная гісторыя ад старажытных часоў да канца XVIII ст. – 2 г у тыдзень, 68 г; Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да канца XVIII ст. – 1 г у тыдзень, 34 г.

XI клас. Сусветная гісторыя XIX-XX стст. – 2 г у тыдзень, 68 г. Гісторыя Беларусі. Канец XVIII-XX ст. – 1 г у тыдзень, 34 г.

На гэтай ступені гістарычнай адукацыі павінны закладвацца асновы тэарэтычнага асэнсавання вучнямі заканамернасцей і асаблівасцей сусветна-гістарычнага працэсу і ажыццяўляцца фарміраванне іх каштоўнасных арыентацый і перакананняў у адпаведнасці з ідэямі гуманізму, патрыятызму і ўзаемаразумення паміж народамі.

Галоўная ўвага ў праграме па сусветнай гісторыі звернута на паваротныя падзеі ў гісторыі чалавецтва. Акцэнт робіцца на вывучэнні і асэнсаванні заканамернасцей і прычынна-выніковых сувязей гістарычнага працэсу, агульнага і асаблівага ў гісторыі асобных краін, рэгіёнаў і цывілізацый. Значнае месца адводзіцца раскрыццю "ўсеагульнасці", глабальнасці гісторыі.

Адна з асноўных задач курса айчыннай гісторыі – вывучэнне яе ў кантэксце гісторыі славянскай, еўрапейскай і сусветнай. На такім фоне, у параўнанні, паказваюцца сацыяльна-эканамічныя, дзяржаўна-палітычныя, рэлігійна-царкоўныя, этнічныя і культурныя працэсы на Беларусі адпаведных перыядаў. Гэта дае магчымасць глыбей і выразней усвядоміць месца і ролю Беларусі ў славянскай і еўрапейскай гісторыі, вызначыць агульнае і асаблівае ў яе гістарычным развіцці.

Праграмы прадугледжваюць асвятленне сутнасці асноўных гістарыяграфічных канцэпцый, якія існуюць па асобных праблемах і перыядах сусветнай і айчыннай гісторыі.

Зыходзячы з асаблівасцей навучання на старэйшай ступені, настаўнікам і выкладчыкам рэкамендуецца шырока выкарыстоўваць розныя формы вучэбных заняткаў: лекцыі, семінары, канферэнцыі; практыкаваць правядзенне дыскусій, самастойных пісьмовых работ, напісанне дакладаў, рэфератаў і г. д. Час, які адводзіцца ў праграмах на вывучэнне раздзелаў і тэм, з'яўляецца прыкладным.

## ПРАГРАМЫ

### *X КЛАС*

**68 г (у тым ліку 3 г — рэзервовы час)**

## СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ АД СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА КАНЦА XVIII СТ.

**Уводзіны (1 г).** Наша ўяўленне аб тым, што такое гісторыя. Паняцце "сусветная гісторыя". Гістарычная перыядызацыя. Паняцце "цывілізацыя" і яе вызначэнне. Асноўныя тэндэнцыі гістарычнага развіцця.

**Першабытная гісторыя чалавецтва (2 г).** Перыядызацыя гісторыі першабытнага грамадства. Праблема паходжання чалавека. Пытанне аб прарадзіме чалавецтва. Ступені эвалюцыі ў напрамку да "чалавека разумнага". Рассяленне старажытных людзей. Першабытная абшчына. Грамадскія адносіны. Зараджэнне першабытнага мастацтва. На шляху да вытворчай гаспадаркі і цывілізацыі. Неалітычная рэвалюцыя. Пераход да земляробства, жывёлагадоўлі і апрацоўкі металаў. Земляробчая абшчына. Племянная супольнасць. Асноўныя цэнтры ранніх земляробчых культур Азіі і Афрыкі.

### РАЗДЗЕЛ I. ЦЫВІЛІЗАЦЫІ СТАРАЖЫТНАГА УСХОДУ І АНТЫЧНАСЦІ (11 г)

**Старажытная гісторыя (1 г).** Змест паняцця "старажытная гісторыя". Геаграфічныя і храналагічныя рамкі гісторыі старажытнасці. Узнікненне старажытных цывілізацый, іх характэрныя рысы. Месца і роля старажытнасці ў гісторыі чалавецтва.

**Тэма 1. Старажытны Усход (5 г)**

**Старажытны Егіпет.** Час і ўмовы ўтварэння старажытнаегіпецкай цэнтралізаванай дзяржавы. Характар улады егіпецкіх фараонаў. Іх абагатварэнне. Асаблівасці сацыяльнай арганізацыі грамадства. Роля рэлігіі і жрэцтва. Егіпецкая дзяржава ў эпоху Новага Царства. Асноўныя дасягненні старажытнаегіпецкай цывілізацыі.

**Старажытная Месапатамія.** Перыядызацыя старажытнай гісторыі Месапатаміі. Гарады-дзяржавы як асобая форма сацыяльна-палітычнай супольнасці ў старажытнасці. Шумерская і акадская гарадскія культуры. Узнікненне Вавілонскай дзяржавы. Заканадаўства Хамурапі. Асірыйская тэрытарыяльная дзяржава. Дасягненні народаў Месапатаміі ў развіцці духоўнай і матэрыяльнай культуры.

**Усходняе Міжземнамор'е ў старажытнасці.** Агульная характарыстыка рэгіёна. Палітычная карта Усходняга Міжземнамор'я ў II тысячагоддзі да н. э. Росквіт Фінікіі. Горад-дзяржава Угарыт. Узнікненне алфавітнага пісьма. Змяненне этнапалітычнай карты Усходняга Міжземнамор'я ў канцы II тыс. да н. э. Старажытнаяўрэйскія плямёны. Дзяржавы на тэрыторыі Палестыны. Асаблівасці сацыяльна-палітычнай і гаспадарчай структуры. Асноўныя дасягненні народаў Усходняга Міжземнамор'я ў развіцці духоўнай і матэрыяльнай культуры.

**Малая Азія ў старажытнасці.** Роля Малой Азіі ў сусветнай гісторыі. Перадумовы ўзнікнення цывілізацый на тэрыторыі Малой Азіі. Гісторыя іх адкрыцця і вывучэння.

Пранікненне індаеўрапейскіх плямён. Хецкая дзяржава. Узаемаадносіны з егіпцянамі, ахейцамі і траянцамі. Хецкая спадчына. Фрыгія і Лідзія, іх уплыў на грэчаскі свет. Культура старажытнай Малой Азіі і сучаснасць.

**Цывілізацыі старажытнай Індыі і Ірана.** Клімат, прыродныя ўмовы. Індская цывілізацыя і яе дасягненні. Выхад на гістарычную арэну індаарыйцаў. Дзяржавы ў даліне Ганга. Рэлігіі старажытнай Індыі. "Веды". Індуізм. Ранні будызм.

Старажытны Іран. Лідзія і дзяржава Ахеменідаў. Дарый і яго рэформы. Зораастрызм, яго ўплыў на сусветныя рэлігіі.

**Старажытнакітайская цывілізацыя.** Своеасаблівасць старажытнакітайскай цывілізацыі. Пачатковы перыяд яе гісторыі. Імперыя Цынь. Утварэнне імперыі Хань, яе захопніцкая палітыка. Вялікі шаўковы шлях. Сацыяльная структура. Рэлігія і асноўныя напрамкі філасофіі. Пранікненне будызму. Дасягненні ў матэрыяльнай культуры, іх значэнне ў жыцці сучаснага чалавека.

**Культура Старажытнага Усходу.** Старажытныя карані сучаснай культуры. Этапы развіцця старажытных сістэм пісьма. Своеасаблівасць літаратур Старажытнага Усходу. Першыя запісы фальклору. Эпас, паэзія, проза.

Дасягненні ў архітэктуры: пірамiды і храмы Егіпта, "Вавілонская башня", Вялікая сцяна ў Кітаі. Выяўленчае

мастацтва: скульптура, рэльеф, жывапіс. Поспехі ў матэматыцы, астраноміі і медыцыне.

**Т э м а 2. Цывілізацыі антычнасці (4 г)**

**Старажытнагрэчаская цывілізацыя.** Перыядызацыя гісторыі Старажытнай Грэцыі. Яе этнічная і геаграфічная карта. "Гамераўская" Грэцыя. Узнікненне гарадоў. Каланізацыйны рух. Зараджэнне поліса. Яго сацыяльныя і палітычныя інстытуты. Праблема рабства і рабаўладальніцкіх адносін у антычнасці. Сістэма духоўных каштоўнасцей поліснага грамадзяніна. Антычная дэмакратыя і сучаснасць.

Крызіс поліса і ўзнікненне міжполісных кааліцый. Узвышэнне Македоніі. Усходнія паходы Аляксандра Македонскага і стварэнне ім "сусветнай дзяржавы". Сістэма элiністычных дзяржаў. Сацыяльная арганізацыя элiністычнага грамадства. Узаемаўплыў і сінтэз культур у эпоху элінізму. Рэлігійны сінкрэтызм. Дасягненні элiністычных народаў у галіне матэрыяльнай культуры.

**Старажытнарымская цывілізацыя.** Перыядызацыя старажытнарымскай гісторыі. Геаграфічная і этнічная карта Старажытнага Рыма.

Гісторыя ўтварэння Рыма. Устанаўленне рэспублікі. Асноўныя сацыяльныя групы рэспубліканскага Рыма. Змаганне плебеяў за свае правы і афармленне рымскай грамадзянскай абшчыны (цывітас). Спецыфіка яе палітычнай арганізацыі.

Заканадаўчае афармленне правоў рымскага грамадзяніна. Катэгорыі залежнага насельніцтва. "Рабская" інтэлігенцыя. Вопыт дыктатуры ў Рыме. Грамадзянскія войны і пераход да імперыі. Стварэнне наёмнай арміі і бюракратычнага дзяржаўнага апарату. Асноўныя напрамкі знешняй экспансіі. Раманізацыя Еўропы. Падзенне Заходняй Рымскай імперыі.

**Культура народаў антычнасці.** Характар касмаганічных і міфалагічных уяўленняў у эпоху антычнасці. Іх адлюстраванне ў рэлігійнай і свецкай літаратуры, звычках, рытуальнай і пахавальнай практыцы.

Старажытнагрэчаскі эпас. Трагедыйны жанр і зараджэнне тэатра. Старажытнарымская літаратура і яе славутыя прадстаўнікі.

Выяўленчае мастацтва. Уплыў рэлігійных уяўленняў і культу на яго развіццё ў старажытнасці. Архітэктура антычнага храма. Ордэнная сістэма. Развіццё грамадзянскай архітэктуры. Буйнейшыя архітэктурныя шэдэўры старажытнасці. Скульптура, яе асноўныя вобразы і сюжэты, прызначэнне. Буйнейшыя скульптары старажытнасці і іх творы, рэльеф і роспіс.

Язычніцкія рэлігіі антычнасці. Важнейшыя філасофскія школы і іх прадстаўнікі. Зараджэнне хрысціянства. Уклад старажытных народаў антычнасці ў скарбніцу сусветнай культуры.



**Паўторна-абагульняльны ўрок (1 г)**

## РАЗДЗЕЛ II. СЯРЭДНЯВЕЧЧА (23 г)

**Уводзіны (1 г).** Сэнс тэрміна "сярэднявечча". Праблема перыядызацыі сярэдневяковай гісторыі.

**Т э м а 3. Сярэдневяковая заходнееўрапейская цывілізацыя (9 г)**

**Еўропа аграрная.** Зямля як галоўны сродак вытворчасці ў сярэдневяковай Еўропе. Прыродныя ўмовы і насельніцтва. Асноўныя сельскагаспадарчыя культуры. Асноўныя прылады земляробства. Сярэдневяковая агратэхніка. Ураджайнасць, забеспячэнне прадуктамі харчавання. Галодныя гады. Жывёлагадоўля і падсобныя промыслы.

**Гарады Заходняй Еўропы.** Шляхі ўзнікнення сярэдневяковых гарадоў. Гарады як цэнтры палітычнага і царкоўнага жыцця, рамяства і гандлю. Насельніцтва сярэдневяковых гарадоў, іх знешні выгляд і архітэктура.

Цэхі і гільдыі. Гарады і таварна-грашовая гаспадарка. Фінансы. Сацыяльнае жыццё ў гарадах. Роля гарадоў у культурным жыцці сярэдневяковай Еўропы.

**Еўропа феадальная.** Раннефеадальнае грамадства. Феадальная іерархія, адносіны сюзерэнітэту-васалітэту. Знаць і рыцарства. Роля феадалаў у палітычным і эканамічным жыцці заходнееўрапейскага грамадства. Духавенства і манаства ў сістэме феадальнай іерархіі.

Феадальнае землеўладанне, яго формы. Феадальная вотчына. Пазямельная і асабістая залежнасць сялян ад феадалаў. Познефеадальнае грамадства.

**Палітычная карта сярэдневяковай Еўропы.** Ранняе сярэднявечча. Ад варварскіх каралеўстваў да імперыі Карла Вялікага. Каралінгская і Візантыйская імперыі. Заваяванні арабаў, нарманаў, венграў у Еўропе. Англасаксонскія каралеўствы.

Еўропа высокага сярэднявечча. Асноўныя еўрапейскія дзяржавы высокага сярэднявечча. Феадальная раздробленасць. Тэрытарыяльнае пашырэнне заходнееўрапейскай цывілізацыі.

Позняе сярэднявечча і час стварэння цэнтралізаваных дзяржаў. Стогадовая вайна паміж Англіяй і Францыяй. Свяшчэнная Рымская Імперыя. Італія ў познім сярэднявеччы.

**Дзяржаўны лад Заходняй Еўропы.** Раннефеадальная дзяржава. Дзяржаўная ўлада і дзяржаўнае кіраванне ў імперыі Карла Вялікага. Раннефеадальная дзяржава. Феадальная манархія, яе сутнасць.

Феадальна-раздробленая дзяржава, роля каралеўскай улады. Асаблівасці дзяржаўнага ладу Францыі, Англіі, Германіі, Італіі ў высокім сярэднявеччы. Саслоўна-прадстаўніцкая манархія, яе сутнасць. Каралеўская ўлада і саслоўна-прадстаўнічыя органы (парламент, Генеральныя штаты, картэсы).

**Еўропа хрысціянская.** Хрысціянізацыя Еўропы. Хрысціянства і язычніцтва. Царкоўная арганізацыя, асаблівасці каталіцкай і праваслаўнай царквы. Роля хрысціянства і царквы ў духоўным і культурным жыцці сярэдневяковай Еўропы. Месца царквы ў эканамічным жыцці. Роля папства ў палітычным жыцці Еўропы. Царква і ерасі. "Свет лацінскі" і "Свет праваслаўны".

**Светаўспрыманне сярэдневяковага еўрапейца.** Рэлігійныя каштоўнасці. Іх уплыў на светаўспрыманне. Свет зямны і свет звышнатуральны. Сярэдневяковая мадэль Сусвету. Успрыманне прасторы і часу. Чалавек і прырода. Чалавек і Бог.

Сярэдневяковая мадэль грамадства. Успрыманне адносін панавання-падпарадкавання. Жыццёвыя арыенціры.

**Культура і быт еўрапейскага сярэднявечча.** Культура духоўная. Пісьменнасць. Адукацыя. Навука. Архітэктура, яе асноўныя стылі. Выяўленчае мастацтва. Літаратура. Ранняе Адраджэнне і гуманізм.

Прадукты харчавання. Жыллё, вопратка. Забавы, святы і спаборніцтвы. Побыт розных сацыяльных груп сярэдневяковага грамадства.

### Т э м а 4. Славянскі свет (5 г)

**Усходнеславянскі свет у эпоху ранняга сярэднявечча.** Тэрыторыя рассялення славян. Іх месца сярод іншых народаў. Характар узаемаадносін з суседзямі.

Адасабленне ўсходніх славян. Нарманскі і візантыйскі ўплыў. Русь і народы азіяцкіх стэпаў. Русь як парубежжа паміж Усходам і Захадам. Своеасаблівасці палітычнага ладу ўсходніх славян.

**Гаспадарчае жыццё ва Усходняй Еўропе.** Умовы гаспадарання. Гаспадарчыя заняткі насельніцтва. Земляробства – аснова гаспадарчай дзейнасці ўсходніх славян. Узмацненне сацыяльнай размежаванасці. Катэгорыі феадальна-залежнага насельніцтва. Узаемаадносіны ў сельскім грамадстве. Усходнеславянскі горад і яго жыхары.

**Развіццё дзяржаўна-палітычнага ладу ва Усходняй Еўропе ў IX-першай палове XVI ст.** Палітычная карта Усходняй Еўропы. Кіеўская Русь, Ноўгарадскае, Полацкае і іншыя раннефеадальныя княствы. Барацьба за першынство. Феадальная раздробленасць. Палітычнае развіццё ва ўмовах мангола-татарскага іга. Русь і Літва. Утварэнне Расійскай дзяржавы.



Эвалюцыя інстытутаў улады. Князь і яго адміністрацыя. Служылыя людзі. Феадальная манархія і феадальная рэспубліка: падабенства і розніца. Развіццё і уніфікацыя заканадаўчай сістэмы. Умацаванне прыгонніцтва. Праваслаўная царква ў сістэме дзяржаўнай улады.

**Паўднёвыя і заходнія славяне: палітычнае развіццё.** Перасяленцкі рух. Абрысы этнічна-племянной карты. Геаграфічныя і кліматычныя ўмовы жыццядзейнасці. Умовы і абставіны станаўлення раннеславянскай дзяржаўнасці. Эвалюцыя дзяржаўнасці. Роля іншаземцаў у гістарычным лёсе славян.

**Асаблівасці сацыяльнай структуры і рэлігійнага жыцця паўднёвых і заходніх славян.** Феадалізацыя славянскага грамадства. Яго асноўныя сацыяльныя групы. Падабенства і спецыфіка сацыяльных лесвіц славянскіх дзяржаў. Царква ў палітычнай сістэме. Канфесіянальныя праблемы. Рэлігійныя рухі.

**Культура паўднёвых, заходніх і ўсходніх славян.** Асноўныя напрамкі развіцця культуры славян у сярэднявечча. Канфесійная прыналежнасць і культура. Культура сярэднявечча Балгарыі і Сербіі. Дзейнасць Кірылы і Мяфодзія. Харвацкая культура. Культура сярэдневяковай Польшчы.

Культура зямель Кіеўскай Русі. Прыняцце праваслаўя і яго ўплыў на развіццё культуры. Новы ўздым культуры ўсходніх славян (XV-XVI стст.).

### Т э м а 5. Цывілізацыі Азіі, Афрыкі і Амерыкі ў сярэднявеччы (6 г)

**Гаспадарчае развіццё Азіі, Афрыкі і Амерыкі.** Аграрны характар эканомікі. Асноўныя сельскагаспадарчыя культуры. Спосабы апрацоўкі зямлі, прылады земляробства. Параўнальны аналіз узроўню земляробства розных цывілізацый. Жывёлагадоўля.

Рамяство і гандаль, формы іх арганізацыі. Транспартныя сродкі, гандлёвыя шляхі. Эканамічныя сувязі паміж цывілізацыямі.

Земляробы і качэўнікі.

**Палітычная карта Азіі, Афрыкі і Амерыкі ў сярэднявечча.** Ачаговы характар цывілізацый, слабасць альбо адсутнасць сувязей паміж імі.

Асноўныя дзяржавы сярэдневяковай Азіі: Кітай, Індыя, Арабскі халіфат, Японія, Асманская дзяржава. Нашэсці качэўнікаў, іх вынікі.

Асноўныя краіны Трапічнай Афрыкі: дзяржавы басейна ракі Нігер, Канем, Эфіопія.

Асноўныя дзяржавы Амерыкі ў сярэднявеччы. Утварэнне і развіццё дзяржаў тольтэкаў, ацтэкаў, мая, інкаў.



2 Зак. 899

Грамадскія адносіны ў сярэдневяковых цывілізацый Азіі і Афрыкі. Праблема існавання феадальных адносін у сярэдневяковых азіяцкіх цывілізацыях. Пазямельныя адносіны і адносіны панавання-падпарадкавання ў Кітаі, Японіі, Арабскім халіфаце, Асманскай імперыі, Індыі. Іх асаблівасці, параўнальны аналіз з феадальнымі адносінамі ў сярэдневяковай Еўропе. Асноўныя рысы дзяржаўнага ладу азіяцкіх краін сярэднявечча.

Асаблівасці гарадскога жыцця азіяцкіх цывілізацый. Формы арганізацыі. Рамяство і гандаль, сацыяльны статус гараджан.

Асаблівасці грамадскіх адносін у цывілізацыях Трапічнай Афрыкі (сацыяльная структура, формы дзяржаўнасці).

**Рэлігіі ў жыцці сярэдневяковых грамадстваў Азіі, Афрыкі і Амерыкі.** Іслам у лёсах сярэдневяковых цывілізацый Азіі і Афрыкі: "Ісламскі свет" сярэднявечча. Сунізм і шыізм. Уплыў ісламу на грамадскія адносіны ў сярэдневяковых грамадствах.

Будызм у лёсах азіяцкіх цывілізацый. Суіснаванне будызму з іншымі рэлігіямі ў шэрагу цывілізацый. Роля будыйскіх манастыроў у эканамічным, духоўным жыцці.

Рэлігіі сярэдневяковых цывілізацый Афрыкі і Амерыкі, іх асноўныя рысы, уплыў на грамадскае жыццё.

**Культура. Светаўспрыманне і быт.** Уплыў рэлігій на светаўспрыманне сярэдневяковага чалавека. Успрыманне сусвету, грамадства. Асаблівасці светаўспрымання сярэдневяковых жыхароў Кітая, Індыі, ісламскіх краін.

Матэрыяльны быт. Асноўныя прадукты харчавання, жыллё, вопратка.

Асноўныя дасягненні навукі і культуры пазаеўрапейскіх цывілізацый у сярэднявеччы. Параўнальны аналіз з Заходняй Еўропай.

**Паўторна-абагульняльны ўрок (1 г)**

## Р А З Д З Е Л III. ГІСТОРЫЯ НОВАГА ЧАСУ (XVI-XVIII СТСТ.) (29 г)

**Уводзіны (1 г)**

**Новы час.** Паняцце "новы час" і яго адметныя рысы. Перыядызацыя гісторыі новага часу. Асаблівасці развіцця цывілізацый Азіі, Афрыкі, Еўропы і Амерыкі. Прагрэс заходнееўрапейскай цывілізацыі.

### Т э м а 6. Заходні свет у XVI-XVIII стст. (11 г)

**Пачатак капіталізму.** Рост еўрапейскай эканомікі і гандлю, развіццё банкаўскай сістэмы. Пераўтварэнне Антверпена ў фінансавую сталіцу Еўропы. Пачатак "атлантычнай эры" ў еўрапейскай эканоміцы. Умяшанне дзяржавы ў эканамічнае жыццё. Франка-іспанскія супярэчнасці. Карл V і Еўропа.

**Гуманізм і Адраджэнне ў XVI стагоддзі.** Змены ў духоўным жыцці і культуры. Гуманізм – філасофія Адраджэння. Супярэчлівы характар гуманізму. Зараджэнне сучаснай навукі. Развіццё палітычных ідэй. "Гасудар" Макіявелі і "Утопія" Мора.

**Еўрапейская каланіяльная экспансія ў XVI-XVIII стст.** Вытокі каланіяльнай экспансіі. Сусветнае значэнне Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Эканамічныя матывы. Роля царквы і дзяржавы. Барацьба еўрапейскіх краін за валоданне марскімі гандлёвымі шляхамі. Утварэнне каланіяльных імперый.

Вынікі каланіяльнай экспансіі для Еўропы і краін Азіі, Афрыкі і Амерыкі. Сустрэча і ўзаемаўплыў цывілізацый.

**Рэфармацыя і рэлігійныя войны.** Рэфармацыя – вялікая перабудова хрысціянскай рэлігіі і еўрапейскага грамадства. Марцін Лютэр. Рэлігійныя рэформы. Сялянская вайна ў Германіі. Пратэстантызм у Швейцарыі. Асаблівасці рэфармацыі ў Англіі. Паўстанне ў Нідэрландах ці першая еўрапейская буржуазная рэвалюцыя. Варфаламееўская ноч у Францыі. Трыццацігадовая вайна 1618-1648 гг. Уплыў Рэфармацыі на станаўленне еўрапейскіх дзяржаў.

**Еўропа ў другой палове XVII стагоддзя.** Еўрапейскі абсалютызм. Францыя Людовіка XIV. Барацьба за еўрапейскае панаванне. Эканамічны застой і дэмаграфічны крызіс у Еўропе.

Англійскі шлях да лібералізму і дэмакратыі. Буржуазная рэвалюцыя ў Англіі. Устанаўленне парламенцкай манархіі ў гэтай краіне.

**Еўрапейская навука і культура XVII стагоддзя.** Навуковая рэвалюцыя. Кеплер, Галілей і Ньютан. Філосафы Дэкарт, Спіноза і Лейбніц. Навука і рэлігія. Усталяванне новай карціны свету. Барока і класіцызм. Літаратура, жывапіс і архітэктура. Рубенс і Рэмбрант. Сервантэс і Шэкспір. Французскі класіцызм. Мальер, Карнэль і Расін.

**Кантрасты XVIII стагоддзя: эпоха Асветніцтва, войны і рэвалюцыі.** Эканамічнае развіццё і сацыяльная структура еўрапейскага грамадства. Арыстакратыя, духавенства і буржуазія. Сельскае і гарадское жыццё. Міграцыя насельніцтва.

Навуковы і тэхнічны прагрэс. Пачатак прамысловай рэвалюцыі ў Англіі. Узаемаўплыў культур. Пачатак фарміравання агульнаеўрапейскай культуры. Сістэма адукацыі. Дзеці і школа. Дзіцячая літаратура.

Характарыстыка эпохі Асветніцтва і яе буйнейшыя прадстаўнікі (Мантэск'е, Вальтэр, Русо, Пейн, французскія энцыклапедысты). Ідэалогія Асветніцтва. Тэорыя народнага

суверэнітэту і падзелу ўлады. Ідэя абмежаванай манархіі. Уплыў ідэалогіі Асветніцтва на Еўропу, Паўночную і Лацінскую Амерыку.

Еўрапейскія манархіі і асветніцкі абсалютызм. Імперыя Габсбургаў. Англа-французскія супярэчнасці. Сямігадовая вайна 1756-1763 гг. і яе вынікі. Вайна за незалежнасць паўночнаамерыканскіх калоній Англіі ці першая амерыканская буржуазная рэвалюцыя. Утварэнне Злучаных Штатаў Амерыкі.

Французская рэвалюцыя 1789-1799 гг. Падзенне феадальнага рэжыму. Рэвалюцыйны тэрор. Устанаўленне ваеннай дыктатуры Напалеона Банапарта ў Францыі. Рэвалюцыйная Францыя і Еўропа.

**Т э м а 7. Расія на шляху да ўсталявання абсалютызму (XV-XVIII стст.) (7 г)**

**"Смутны час" і першая грамадзянская вайна ў Рускай дзяржаве.** Канец дынастыі Рурыкавічаў. Б. Гадуноў. Баярскія інтрыгі. "Крызіс вярхоў". Галодныя гады і бунты. Самазванцы. Інтэрвенцыя і грамадзянская вайна. Апалчэнне. Вызваленне Масквы. Барацьба за трон. М. Раманаў.

**Эканамічнае развіццё Расіі.** Ліквідацыя вынікаў смуты. Узмацненне прыгонніцтва. Новае ў эканоміцы. Гарады. Гандаль. Рамёствы. Развіццё прамысловасці: мануфактура, заводы, прадпрымальніцтва. Каланізацыя.

**Ад Маскоўскага царства да Расійскай імперыі (станаўленне абсалютызму).** Баярская дума. Земскія саборы і ўзмацненне іх ролі. Загады. Саборнае ўлажэнне 1649 г. – першы збор (Кодэкс) законаў Расійскай дзяржавы. Зараджэнне абсалютызму. Царкоўны раскол. Пётр I – імператар. Рэформы кіравання. Царква і дзяржава. Дваранства – апора самадзяржаўя. "Асветніцкі абсалютызм".

**Знешняя палітыка Расіі.** Войны з Рэччу Паспалітай. Прасоўванне да Ціхага акіяна. Спробы выхаду да Чорнага мора.

Міжнародная абстаноўка ў пачатку XVIII ст. Азоўскія паходы. Пачатак Паўночнай вайны. Рэарганізацыя арміі. Першыя перамогі. Палтаўская баталія. Пруцкі паход. Поспехі на моры. Ніштацкі мір. Каспійскі паход. Удзел у Сямігадовай вайне. Руска-турэцкія войны. Італьянскі і швейцарскі паходы Суворава. Вынікі знешняй палітыкі.

**Культура ў XV-XVIII стст.** Асаблівасці развіцця культуры ў новы час. Пачатак абміршчэння культуры. Адлюстраванне падзей у літаратуры і жывапісе. Дойлідства. "Рускае барока". Адукацыя. Навуковыя веды і тэхніка.

Новыя павевы пятроўскай эпохі: школы, развіццё навукі і тэхнікі. Рэформы ў галіне культуры.

Узмацненне культурных сувязей з Заходняй Еўропай. Акадэмія навук, універсітэт, экспедыцыі. М. В. Ламаносаў. Эпоха Асветніцтва, літаратура, тэатр, жывапіс, архітэктура. Новыя з'явы ў быце і культуры расійскіх людзей.

**Т э м а 8. Славянскія народы ў XV-XVIII стст. (2 г)**

Агульная характарыстыка славянскіх народаў у XVI-XVII стст. Утварэнне Рэчы Паспалітай. Этнарэлігійны склад яе насельніцтва. Нацыянальна-вызваленчы рух. Падзелы Рэчы Паспалітай. Беларусь і Украіна ў складзе Расійскай імперыі.

Славянскія народы пад уладай Габсбургаў. Паўднёвыя славяне пад турэцкім прыгнётам. Распаўсюджванне ідэі славянскага адзінства. Польска-ўкраінскія землі ў складзе Аўстрыі і Прусіі.

Асаблівасці развіцця культуры славянскіх народаў.

**Т э м а 9. Свет Усходу і Афрыка ў XVI-XVIII стст. (7 г)**

**Асноўныя рысы ўсходняга традыцыйнага грамадства.** Паняцце "традыцыйнае грамадства". Асноўныя цэнтры феадалізму на Усходзе: Асманская імперыя (Турцыя), Індыя і Кітай. Асаблівасці ўсходняга феадалізму. Яго адрозненне ад еўрапейскага. Адсутнасць або слабае развіццё прыватнай уласнасці. Вярхоўная ўласнасць дзяржавы на зямлю. Захаванне абшчыннай гаспадаркі. Саслоўі. Сялянства – аснова традыцыйнага ўсходняга грамадства. Дзяржаўна-рэлігійная рэгламентацыя жыцця. Уяўленне аб навакольным свеце, адносіны да еўрапейцаў.

**Каланіялізм на Усходзе.** Каланізацыя як з'ява сусветна-гістарычнага значэння. Паняцце "калонія". Сувязь каланізацыі з еўрапейскім капіталізмам. Этап гандлёвай экспансіі. Масавае прыгнечанне людзей (гандаль рабамі). Пачатак тэрытарыяльных захопаў. Працэс развіцця і ўзаемаўплыў культур. Паступовае далучэнне Усходу і Афрыкі да сусветнай гісторыі.

**Развітыя рэлігійныя сістэмы Усходу.** Іслам і індабудызм. Этычная сістэма канфуцыянства ў Кітаі. Сінтаізм, будызм і канфуцыянства ў Японіі. Іх светапогляднае ўздзеянне на фарміраванне ўкладу жыцця і менталітэту людзей, на фарміраванне норм сацыяльна-сямейнага жыцця і дзяржаўнасці. Распаўсюджванне ісламу ў Афрыцы.

**Асманская імперыя (Турцыя).** "Залаты век" цэнтралізаванай імперыі. Кіраванне Сулеймана Цудоўнага. Заняпад ваенна-леннай сістэмы і магутнасці імперыі ў XVIII ст. Эканамічнае і палітычнае, сацыяльнае, навукова-тэхнічнае і культурнае адставанне Асманскай імперыі ад Еўропы. Страта самастойнасці ў міжнародных справах. Узнікненне так званага ўсходняга пытання. Арабскія краіны пад уладай Турцыі.

**Імперыя Вялікіх Маголаў у Індыі.** Кіраванне Акбара – залаты век Вялікіх Маголаў. Хуткі заняпад і распад імперыі. Прэтэндэнты на моцную ўладу ў Індыі. Дзяржава маратхаў. Умяшанне іранскага Надзір-шаха. Заваёўніцкія паходы афганцаў. Англічане ў Індыі. Палітыка англійскай Ост-Індскай кампаніі. Пачатак пераўтварэння Індыі ў англійскую калонію.

Культура народаў Індыі ў эпоху Вялікіх Маголаў. Узаемадзеянне ісламу і індуізму. Літаратура, мастацтва і архітэктура.

**Цынская імперыя ў Кітаі.** Заваяванне Кітая маньчжурамі і ўтварэнне імперыі Цын. Прыняцце маньчжурамі канфуцыянства. Захаванне кітайскага традыцыйнага грамадства. Інтэнсіўнае развіццё гарадоў, рамёстваў і гандлю. Актыўная заваёўніцкая палітыка. Тэрытарыяльныя набыткі. Цынскі Кітай і знешні свет. Адносіны з еўрапейцамі. Руска-кітайскія адносіны. "Закрыццё" краіны.

Духоўнае жыццё і культура. Уяўленні аб Сусвеце. Рэлігія. Кітайская сям'я. Школа і адукацыя.

**Японія пры сёгунах Такугава.** Аб'яднанне краіны на мяжы XVI-XVII стст. Сістэма сёгунату. Рэформы, накіраваныя на ўмацаванне цэнтральнай улады. Ізаляцыя Японіі ад знешняга свету. Адносны росквіт Японіі ў XVII ст. Паступовы заняпад у XVIII ст.

Пранікненне еўрапейскай навукі і культуры. Здольнасць японцаў пераймаць усё карыснае ў іншых. Адраджэнне канфуцыянства. Яго ўздзеянне на ўклад жыцця (патэрналізм, адданасць старэйшым, моцная сям'я, культ этычнай нормы). Культура.

**Афрыка на поўдзень ад Сахары.** Прыродна-кліматычныя ўмовы пражывання чалавека. Адносная ізаляцыя шматлікіх этнічных суполак. Запаволеныя тэмпы развіцця. Абшчынна-радавая аснова грамадства. Адсутнасць развітой рэлігіі і пісьмовай культуры. Асноўныя дзяржаўныя ўтварэнні. Каланіяльнае ўмяшанне еўрапейцаў. Гандаль рабамі і яго вынікі для Афрыканскага кантынента.

**Паўторна-абагульняльны ўрок (1 г)**

АГУЛЬНАГІСТАРЫЧНЫЯ ВЕДЫ (ПАНЯЦЦІ, ПРАБЛЕМЫ, ІДЭІ)

Асноўныя этапы гісторыі чалавецтва. Паняцце "сусветная гісторыя". "Цывілізацыя" і яе вызначэнне.

Асноўныя рысы развіцця першабытнага грамадства. Навуковыя гіпотэзы аб паходжанні чалавека. Рассяленне старажытнага чалавецтва.

Зараджэнне і развіццё першабытных калектываў.



Асноўныя гаспадарчыя заняткі першабытных людзей. Рэлігійныя вераванні. Зараджэнне мастацтва. Важнейшыя адкрыцці і вынаходніцтвы. Помнікі мастацтва.

Паняцце "старажытная гісторыя". Перыядызацыя гісторыі старажытнага свету. Гісторыка-геаграфічная карта старажытных цывілізацый.

Чалавек у эпоху старажытных цывілізацый. Каштоўнасці і спосаб жыцця старажытнаўсходняга і антычнага грамадстваў.

Асаблівасці сацыяльных структур ва ўсходнім і антычным грамадствах.

Утварэнне і развіццё дзяржаў. Асноўныя формы дзяржаў у старажытнасці. Усходнія дэспатыі і антычны поліс. "Сусветныя імперыі". Асноўныя падзеі палітычнай гісторыі і сацыяльныя рухі. Узнікненне сусветных рэлігій (будызм, хрысціянства).

Культурная спадчына народаў старажытнага Усходу і антычнага свету. Выдатныя дзеячы культуры. Уклад старажытных цывілізацый у сусветную культуру.

Вынікі развіцця старажытных цывілізацый і іх месца ў гісторыі чалавецтва.

Паняцце "сярэднявечча". Перыядызацыя гісторыі сярэдніх вякоў.

Чалавек у эпоху сярэднявечча. Характэрныя рысы спосабу жыцця розных сацыяльных груп. Этнічныя працэсы. Рэлігійныя сістэмы Еўропы і Усходу і іх уплыў на сацыяльна-палітычнае і культурнае жыццё.

Гаспадарчае жыццё. Аграрная і рамесная вытворчасць. Развіццё таварна-грашовага абмену.

Сацыяльнае развіццё. Фарміраванне феадальнай знаці і залежнага сялянства. Асноўныя саслоўі. Фарміраванне дваранства ў Еўропе і асаблівасці гэтага працэсу на Русі. Сацыяльныя структуры ўсходніх грамадстваў.

Сярэдневяковы еўрапейскі горад. Гарады на Усходзе. Царква. Дзяржаўна-палітычнае развіццё. Яго асаблівасці ў Еўропе і на Усходзе. Тыпы дзяржаўна-палітычных утварэнняў: імперыі, цэнтралізаваныя манархіі, гарады-дзяржавы. Формы палітычнай улады. Асноўныя падзеі палітычнай гісторыі. Сацыяльныя рухі ў сярэднявеччы.

Рэлігійнае жыццё. Царква ў Еўропе. Рэлігійныя плыні. Ерасі. Інквізіцыя. Роля царквы ў гісторыі Расіі. Асаблівасці рэлігійнага жыцця ў сярэдневяковых цывілізацыях Усходу.

Культура еўрапейскага і ўсходняга сярэднявечча. Асаблівасці культуры народаў сярэдневяковай Русі, яе помнікі. Асноўныя культурныя цэнтры і дасягненні. Асноўныя культурныя цэнтры народаў Усходу. Своеасаблівасць культурнага і духоўнага жыцця розных краін і рэгіёнаў.

Паняцце "новы час". Перыядызацыя. Сусветнае значэнне Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.

Змяненне спосабу жыцця і дзейнасці, сацыяльнага становішча чалавека ў новы час.

Развіццё матэрыяльнай вытворчасці, тэхнікі. Еўрапейская эканоміка і гандаль, банкаўская сістэма. Развіццё капіталістычнай гаспадаркі ў краінах Еўропы, асаблівасці гэтага працэсу ў Расіі. Захаванне традыцыйнага аграрнага грамадства ў Індыі, Кітаі, у народаў Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.

Каланізацыйныя працэсы і каланіяльная палітыка. Развіццё дзяржаў у новы час. Абсалютызм і саслоўныя манархіі ў краінах свету, агульнае і асаблівае ў іх развіцці. Паступовае зацвярджэнне канстытуцыйных і рэспубліканскіх форм кіравання. Асноўныя падзеі ў палітычным развіцці краін свету.

Царква і рэлігія. Асаблівасці адносін царквы і ўлады ў розных дзяржавах свету.

Сацыяльныя рухі ў новы час. Буржуазныя рэвалюцыі.

Развіццё еўрапейскай навукі. Характарыстыка эпохі Асветніцтва. Асаблівасці развіцця рускай культуры. Культура краін Усходу. Асноўныя напрамкі, плыні, жанры мастацкай культуры.

Міжнародныя адносіны ў новы час. Войны і дыпламатыя.

## *X КЛАС*
## 34 г (у тым ліку 4 г – рэзервовы час)

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ АД СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА КАНЦА XVIII СТ.

**Уводзіны.** Гісторыя Айчыны – неад'емная частка гісторыі Еўропы і свету. Перыядызацыя курса. Асноўныя крыніцы і даследаванні, гістарыяграфічныя канцэпцыі.

### РАЗДЗЕЛ І. СТАРАЖЫТНАЕ ГРАМАДСТВА. БЕЛАРУСЬ У VI – СЯРЭДЗІНЕ XIII СТ. (11 Г)

**Т э м а 1. Гаспадарка, грамадскі лад і побыт першабытных людзей (100 тыс. гадоў да н. э. – V ст. н. э.) (2 г)**

Старажытнае грамадства ў эпоху каменнага і бронзавага вякоў. Засяленне тэрыторыі Беларусі першабытнымі людзьмі. Уплыў клімата. Асноўныя археалагічныя культуры. Пераход ад збіральніцтва да вытворчай гаспадаркі. Эвалюцыя шлюбна-сямейных адносін і грамадскага ладу.

**Насельніцтва Беларусі ў раннім жалезным веку** (VIII ст. да н. э. – V ст. н. э.). Асноўныя археалагічныя культуры



гэтай эпохі на тэрыторыі Беларусі. Праблемы іх этнічнай ідэнтыфікацыі. Распад індаеўрапейскага праэтнасу і ўзнікненне славян, балтаў, германцаў і іншых народаў. Тэрыторыі іх рассялення. Змены ў гаспадарцы, матэрыяльнай і духоўнай культуры, побыт насельніцтва.

**Тэма 2. Паходжанне беларусаў. Дзяржаўна-палітычны і грамадскі лад на Беларусі ў VI – сярэдзіне XIII ст. (3 г)**

**Паходжанне беларусаў.** Насельніцтва Беларусі ў сярэдзіне I тысячагоддзя н. э. Засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі. Славянізацыя балтаў у міжрэччы Прыпяці, Дняпра, Заходняй Дзвіны, верхняга і сярэдняга Панямоння – пачатак утварэння беларускага этнасу. Супольнасці крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. Асноўныя канцэпцыі аб паходжанні ўсходнеславянскіх народаў – беларусаў, велікарусаў і ўкраінцаў.

**Першыя дзяржавы-княствы на тэрыторыі Беларусі.** Узнікненне дзяржаўнасці ў "варварскіх" народаў Заходняй і Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Погляды гісторыкаў на праблему паходжання дзяржавы ва ўсходніх славян і назвы "Русь". Пашырэнне ўлады кіеўскіх князёў на іншыя землі ўсходніх славян. Полацкае княства: тэрыторыя, дзяржаўны лад, барацьба за самастойнасць. Тураўскае княства. Землі верхняга і сярэдняга Падняпроўя. Пасожжа, Пабужжа і Панямоння (палітычная гісторыя).

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Складванне феадальных адносін.** Узнікненне феадалізму ў Заходняй і Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Грамадскі лад і гаспадарка Кіеўскай Русі: погляды гісторыкаў. Фарміраванне класавага грамадства ва ўсходніх славян. Узнікненне і рост гарадоў. Шматукладнасць гаспадаркі. Умацненне феадальнага ўкладу. Агульнае і асаблівае ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларускіх земляў і ў побыце насельніцтва ў VI-XIII стст. у параўнанні з іншымі рэгіёнамі.

**Т э м а 3. Царква і культура (4 г)**

**Язычніцкія вераванні. З'яўленне і распаўсюджванне хрысціянства.** Паходжанне рэлігіі. Агульнае і асаблівае ў язычніцкіх вераваннях насельніцтва Беларусі ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі. Сутнасць хрысціянства. Яго распаўсюджанне ў Еўропе. Прычыны прыняцця хрысціянства як афіцыйнай рэлігіі. Спалучэнне хрысціянства і язычніцкіх вераванняў у народнай свядомасці, традыцыях і абраднасці. Значэнне прыняцця хрысціянства для ўсходніх славян. З'яўленне дзвюх хрысціянскіх цэркваў. Уплыў хрысціянства на культуру, палітычнае жыццё, нормы маралі.

**Архітэктура і жывапіс.** Архітэктурныя стылі ранняга сярэднявечча ў краінах Заходняй Еўропы і ў Візантыі.

Архітэктура і жывапіс Кіеўскай Русі. Манументальнае дойлідства і фрэскавы жывапіс Беларусі. Прыкладное мастацтва. Уплыў Візантыі і іншых краін на культуру Беларусі.

**Фальклор і пісьменства.** Старажытны фальклор. Народны каляндар. Звычаі і абрады насельніцтва Беларусі. З'яўленне пісьменства. Летапісанне і летазлічэнне ва ўсходніх славян. Звесткі пра Кіеўскую Русь і землі Беларусі ў летапісах і паданнях іншых краін і народаў. Літаратура. Арыгінальныя беларускія "жыцці". Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Кліменцій Смаляціч. Помнікі эпіграфікі і сфагістыкі. З'яўленне пісьмовых помнікаў з характэрнымі прыкметамі беларускай мовы.

Наш край у старажытныя часы і ў раннім сярэднявеччы.

**Паўторна-абагульняльны ўрок**

Эвалюцыя старажытнага грамадства на землях Беларусі ў эпоху першабытна-абшчыннага ладу. Паходжанне беларускага этнасу. Першыя раннесярэдневяковыя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. Культурныя дасягненні Беларусі IX-XIII стст. на фоне іншых краін і рэгіёнаў.

## Р А З Д З Е Л II. БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIII-XVIII СТ. (19 Г)

### Т э м а 4. Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае (7 г)

**Феадальная раздробленасць на землях Беларусі. Знешнепалітычная сітуацыя ў канцы XII – першай палове XIII ст.** Прычыны феадальнай раздробленасці. Удзельныя княствы і іх узаемаадносіны. Палітыка полацкіх князёў у дачыненні да лета-літоўскіх плямён. Грамадскі лад і ўзровень сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця лета-літоўцаў у канцы XII – пачатку XIII ст. Паход лета-літоўскіх дружын на Русь. Агрэсія нямецкіх феадалаў-крыжакоў ва Усходняй Прыбалтыцы. Мангола-татарскае нашэсце на Русь і ў Цэнтральную Еўропу. Пагроза заняволення беларускіх і літоўскіх зямель. Неабходнасць іх ваенна-палітычнага саюза.

**Станаўленне і ўмацаванне Вялікага княства Літоўскага.** Верхняе Панямонне ў канцы XII – пачатку XIII ст. Феадальныя войны ў Паўднёва-Заходняй Русі. Набегі Літвы. Узвышэнне Міндоўга. Міндоўг – князь Навагрудскі. Верхняе Панямонне – цэнтр збірання беларуска-літоўскіх зямель у адзіную дзяржаву. Узаемаадносіны з Галіцка-Валынскім княствам. Параўнанне працэсаў узнікнення цэнтралізаваных феадальных дзяржаў ва Усходняй і Заходняй Еўропе.



**Палітычная сітуацыя ў еўраазіяцкім рэгіёне.** Дзяржаваўтваральніцкія працэсы ў другой палове XIII – першай палове XIV ст. ва Усходняй Еўропе. Вялікае княства Літоўскае і Рускае як цэнтр збірання усходнеславянскіх земляў. Усходнеславянскі фундамент гэтай дзяржавы. Федэратыўная аснова будовы дзяржавы і цэнтралізатарскія тэндэнцыі ў палітыцы вялікіх князёў літоўскіх.

**Знешнепалітычнае становішча ў XIV – першай палове XVI ст.** Адносіны Вялікага княства Літоўскага з Візантыяй і Ватыканам. Польска-літвінскія уніі і канфлікты. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй. Пачатак маскоўскай экспансіі на землі Вялікага княства Літоўскага.

**Вярхоўная ўлада.** Уладныя прэрагатывы вялікага князя. Рада. Сойм. Заканадаўства. Роля беларускай знаці ў кіраванні дзяржавай.

**Мясцовае кіраванне.** Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел і сістэма мясцовых органаў улады і кіравання. Эвалюцыя судовай сістэмы.

**Вялікае княства Літоўскае ў палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай.** Перадумовы ўтварэння Рэчы Паспалітай. Умовы аб'яднання Кароны Польскай і Вялікага Княства. Рэч Паспалітая на палітычнай карце Еўропы. Інтэграцыйныя і дэзінтэграцыйныя працэсы ў палітыка-дзяржаўным развіцці Рэчы Паспалітай. Умяшальніцтва ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай суседніх дзяржаў і яе падзелы. Гісторыкі аб падзелах Рэчы Паспалітай і далучэнні Беларусі да Расійскай імперыі.

### Т э м а 5. Развіццё феадальных адносін (3 г)

**Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця.** Разлажэнне феадальнай сістэмы і складванне буржуазнага грамадства ў Заходняй Еўропе. Уплыў сацыяльна-гаспадарчых працэсаў у заходне-еўрапейскім рэгіёне на эканамічнае развіццё краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Аграрны характар эканомікі Вялікага княства Літоўскага. Станаўленне фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання. Яе асноўныя рысы. Юрыдычнае афармленне прыгонніцтва. Стан гарадоў і эвалюцыя гарадскога жыцця.

**Унутраны гандаль і знешнеэканамічныя сувязі.** Развіццё рынкавых адносін. Беларускія землі ў гандлёва-эканамічных стасунках еўрапейскіх краін. Унутрыэканамічныя сувязі і этнічная кансалідацыя.

**Класы-саслоўі феадальнага грамадства.** Змены ў саслоўна-класавай структуры грамадстваў заходнееўрапейскіх дзяржаў. Фарміраванне асноўных класаў-саслоўяў феадальнага грамадства Вялікага княства Літоўскага:

шляхты, сялянства, мяшчанства і іх узаемастасункі. Класавая барацьба і сацыяльныя канфлікты.

**Т э м а 6. Царква і рэлігія (2 г)**

**Праваслаўе і каталіцызм.** Роля і месца царквы ў феадальным грамадстве. Канфесійная сітуацыя ў Еўропе. Беларускія землі на памежжы двух хрысціянскіх веравызнанняў. Месца праваслаўнай царквы ва ўнутранай і знешняй палітыцы вялікіх князёў Міндоўга, Войшалка, Гедыміна, Альгерда. Распаўсюджанне каталіцызму і яго прывілеяванае становішча ў Вялікім княстве Літоўскім. Крызіс праваслаўнай царквы ў Вялікім Княстве. Спроба ўстанаўлення над ёю апекі і выкарыстання ў сваіх мэтах з боку Масквы.

**Рэфармацыя і уніяцтва.** Рэфармацыйны рух: плебейска-сялянская і шляхецка-бюргерская плыні. Асаблівасці рэфармацыі на беларускіх землях. Контррэфармацыя. Уніяцтва. Роля рэлігійнага пытання ў падзелах Рэчы Паспалітай.

**Т э м а 7. Этнічныя працэсы (3 г)**

**Беларускі этнас.** Складванне этнічнай тэрыторыі беларусаў. Фарміраванне этнічнай свядомасці. Менталітэт беларусаў. Уплыў войнаў і сацыяльна-палітычных канфліктаў на этнасацыяльнае развіццё беларусаў.

**Народная матэрыяльная і духоўная культура.** Прылады працы. Жыллё і будовы. Рамёствы і промыслы. Адзенне. Ежа і пітво. Сям'я і побыт. Вераванні, мараль, традыцыі, абрады, звычаі, фальклор, мелас беларусаў.

**Этнічныя меншасці.** Татарскае і яўрэйскае насельніцтва Беларусі – рассяленне, заняткі, культура. Іншыя народы ў этнічных працэсах на беларускіх землях.

**Т э м а 8. Рэнесанс на Беларусі. Шляхам барока і асветніцтва. Класіцызм (3 г)**

**Беларускае Адраджэнне.** Характарыстыка эпох у культурным развіцці Еўропы. Прычыны ўзнікнення і развіццё ідэй Адраджэння на Беларусі. Спецыфічныя асаблівасці беларускага Рэнесансу. Сувязь з заходне-еўрапейскімі рэнесансавымі традыцыямі. Дзеячы Адраджэння і Рэфармацыі.

**Барока. Асветніцтва. Класіцызм.** Развіццё асветы. Навука. Грамадска-палітычная думка. Літаратура: рэлігійная, свецкая, гісторыка-мемуарная. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура. Тэатр.

Наш край у XIII-XVIII стст.

**Паўторна-абагульняльны ўрок**

Месца беларускіх зямель у міжнародным падзеле працы і гандлёвых стасунках у еўраазіяцкім рэгіёне. Вялікае княства Літоўскае ў палітычнай сістэме ўсходнееўрапейскіх дзяржаў. Этнаканфесійныя працэсы на беларускіх землях у XIII-XVIII стст.



### АГУЛЬНАГІСТАРЫЧНЫЯ ВЕДЫ (ПАНЯЦЦІ, ПРАБЛЕМЫ, ІДЭІ)

Гісторыя Беларусі – частка гісторыі Еўропы і свету. Сэнс паняцця "гісторыя Айчыны". Асноўныя падзеі і працэсы ў гісторыі Беларусі.

Праблема паходжання беларусаў. Этнічныя меншасці. Узаемасувязь этнічных працэсаў і дзяржаўна-палітычнага развіцця.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Сацыяльная структура грамадства. Шматукладнасць гаспадаркі. Натуральная гаспадарка. Асноўныя рысы фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання. Прыгоннае права.

Развіццё рынкавых адносін. Гандлёва-эканамічныя сувязі беларускіх зямель з еўрапейскімі краінамі. Дзяржаўнае і палітычнае жыццё. Эвалюцыя дзяржаўнасці. Формы дзяржаўнай улады і кіравання.

Міжнародныя адносіны. Беларусь у сістэме міжнародных адносін.

Прычыны, характар і формы сацыяльных рухаў, роля палітычных дзеячаў.

Рэлігійныя вераванні. Роля царквы ў гісторыі Беларусі. Рэлігійныя рухі і плыні.

Асаблівасці развіцця культуры на Беларусі. Асноўныя напрамкі і знакамітыя прадстаўнікі культуры. Побыт і норавы. Уплыў рэлігій на культуру і духоўнае жыццё. Уклад Беларусі ў культуру славянскага свету і Еўропы.

Роля і месца Беларусі ў гісторыі Еўропы і свету.

### АСНОЎНЫЯ ЎМЕННІ ВУЧНЯЎ

Суадносіць гістарычныя з'явы, працэсы з перыядам, эпохай на аснове ведання навуковай перыядызацыі гісторыі;

аналізаваць і абагульняць, параўноўваць, тлумачыць гістарычныя факты на аснове рознабаковага вывучэння крыніц;

даваць ацэнку гістарычным з'явам і дзейнасці людзей у гісторыі;

тлумачыць асобныя заканамернасці і асаблівасці гістарычнага развіцця;

працаваць з рознымі крыніцамі гістарычных ведаў: гістарычнымі дакументамі, перыядычным друкам, грамадска-палітычнай літаратурай; супастаўляць і аналізаваць інфармацыю розных крыніц, аргументаваць свае адносіны да ацэнак, якія выкладзены ў дадзеных матэрыялах;

складаць канспекты, тэзісы, рыхтаваць рэферат і даклад, самастойна падбіраць літаратуру, удзельнічаць у школьнай дыскусіі.

*XI КЛАС*

**68 гадзін (у тым ліку 3 г – рэзервовы час)**

## СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ XIX-XX СТСТ. (68 г)

**Уводзіны (1 г).** Змест і перыядызацыя сусветнай гісторыі XIX-XX стст. Навукова-тэхнічны прагрэс і паскарэнне гістарычнага развіцця. Войны і рэвалюцыі. Нацыянальна-вызваленчыя рухі. Дэкаланізацыя. Барацьба за сацыяльны прагрэс і дэмакратыю. Змены на палітычнай карце свету. Глабальныя праблемы сучаснасці. Інтэграцыйныя працэсы ў сусветным згуртаванні.

### РАЗДЗЕЛ І. СВЕТ У XIX – ПАЧАТКУ XX СТ. (27 Г)

**Т э м а 1. Заходняя Еўропа (8 г)**

**Еўропа ў эпоху напалеонаўскіх войнаў.** Уплыў французскай рэвалюцыі на Еўропу. Напалеон Банапарт як прэтэндэнт на сусветнае панаванне. Супрацьстаянне і войны. Разбурэнне феадальна-абсалютысцкіх парадкаў у Еўропе. Трыумф і крушэнне напалеонаўскай імперыі. Свяшчэнны Саюз. Усталяванне Венскай сістэмы міжнародных адносін.

**Нацыянальныя рухі, рэвалюцыі і змены на палітычнай карце Еўропы.** Рост нацыянальнай самасвядомасці еўрапейскіх народаў. Распаўсюджанне ідэй лібералізму. Рух "Маладая Італія". Барацьба грэчаскага народа за нацыянальную незалежнасць. Рэвалюцыі 1830-1831 гг. Утварэнне незалежных дзяржаў (Грэцыя і Бельгія). Еўрапейская "вясна народаў" альбо рэвалюцыі 1848-1849 гг. Аб'яднанне Італіі і Германіі.

**Індустрыялізацыя Еўропы ў XIX ст.** Навукова-тэхнічны прагрэс. Прамысловая рэвалюцыя і яе асаблівасці. Перамены ў сельскай гаспадарцы. Нераўнамерны характар развіцця капіталістычнай эканомікі. Эканамічныя крызісы. Значэнне і вынікі індустрыялізацыі.

**Насельніцтва і рост гарадоў.** Дэмаграфічная рэвалюцыя. Міграцыя насельніцтва і яе прычыны. Зараджэнне сучаснай сям'і. Рост гарадоў. Урбанізацыя і праблемы, выкліканыя ёю. Развіццё медыцыны і грамадскай аховы здароўя.

**Змены ў сацыяльнай структуры еўрапейскага грамадства.** Бляск і галеча арыстакратыі. З'яўленне сучаснага сялянства. Буржуазія і яе ўклад жыцця. Фарміраванне "сярэдняга класа" і яго месца ў грамадстве. Пралетарыят. Становішча жанчын.



**Рабочы і сацыялістычны рух.** Пачатак барацьбы рабочых за сацыяльныя правы. Ад лудзізму да стварэння прафсаюзаў і рабочых партый. Удзел у палітычнай барацьбе. Парыжская камуна. Сацыяльныя заваёвы рабочых у другой палове XIX ст.

Зараджэнне сацыялістычнай ідэалогіі. Узнікненне марксізму. Утварэнне сацыялістычных партый. I і II Інтэрнацыяналы. Еўрапейская сацыял-дэмакратыя на пачатку першай сусветнай вайны.

**Рэлігія і рэлігійнае жыццё.** Рэлігійная карта Еўропы ў XIX ст. Еўропа каталіцкая і Еўропа праваслаўная. Адносіны паміж рэлігіяй і дзяржавай. Канфрантацыя паміж рэлігіяй і навукай. Узмацненне антыклерыкалізму, распаўсюджанне атэізму. Прыстасаванне каталіцкай царквы да новых умоў. Энцыкліка "Рэрум наварум" папы Льва XIII (1891 г.).

**Еўрапейская культура.** Важнейшыя праявы духоўнай і матэрыяльнай культуры. Развіццё навукі і тэхнікі. Асноўныя плыні культурнага жыцця: рамантызм, рэалізм, сімвалізм. Літаратура, мастацтва і архітэктура. Перамены ў складзе жыцця еўрапейскага грамадства. Прыкметы заняпаду духоўнай культуры.

**Сістэма ваенна-палітычных блокаў і саюзаў у другой палове XIX – пачатку XX ст.** Усходняя вайна 1853-1856 гг. і крах Венскай сістэмы міжнародных адносін. На шляху да Траістага Саюза (1882 г.). Зближэнне Расіі і Францыі (1891-1893 гг.). Утварэнне Антанты. Абвастрэнне супярэчнасцей паміж вялікімі дзяржавамі ў пачатку XX ст.

**Т э м а 2. Расія: ад манархіі феадальнай да буржуазнай рэспублікі (6 г)**

**Агульнае і адметнае ў эканамічным развіцці Расіі.** Расія – састаўная частка сусветнага супольніцтва. Змена феадалізму капіталізмам – асноўны змест сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Расія – "даганяючая" мадэль развіцця эканомікі. Галоўныя перашкоды на шляху мадэрнізацыі краіны. Эканамічнае развіццё пасля адмены прыгоннага права. Цыклічнасць развіцця эканомікі. Асаблівасці расійскага імперыялізму і эканоміка Расіі да пачатку 1914 г.

**На шляху станаўлення грамадзянскага грамадства.** Асаблівасці расійскага абсалютызму. Саслоўі, іх прывілегіі, правы, абавязкі. Прыгонніцкі гнёт. Сацыяльная палітыка самадзяржаўя. Канстытуцыйныя праекты першай чвэрці XIX ст. Непазбежнасць рэформаў. Вызваленне сялян.

Рэформы 60-70 гг. – пачатак грамадзянскага разняволення. Паступовая адмова ад ідэй канстытуцыяналізму. Канстытуцыйныя патрабаванні ў праграмах рускіх палітычных партый.

Буржуазныя рэвалюцыі і рэформы ў пачатку XX ст. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. Першы расійскі парламент. Ад Дзяржаўнай думы да Устаноўчага сходу.

**Знешняя палітыка Расійскай імперыі.** Асноўныя напрамкі расійскай знешняй палітыкі. Удзел у антынапалеонаўскіх кааліцыях і "Свяшчэнным саюзе". Расія і праблема праліваў. Саюзнікі ў Еўропе сталі ворагамі на Усходзе. Ад Парыжскага міру (1856 г.) да Лонданскай канферэнцыі (1871). Усходні крызіс. Берлінскі кангрэс. Заваяванне Сярэдняй Азіі. Удзел у блоках і саюзах на мяжы стагоддзяў.

**Уклад Расіі ў сусветную культуру.** Асноўныя этапы гісторыі рускай культуры. Мастацкая культура Расіі – набытак усяго чалавецтва. Рускія вучоныя – нобелеўскія лаўрэаты і члены замежных акадэмій. Сацыяльна-філасофская і рэлігійная думка Расіі. Сусветнае прызнанне рускай літаратуры. Мадэрнізм і дэкадэнства ў літаратуры і мастацтве. Рускі авангардызм. Тэатр. Балет. Узаемасувязі рускага мастацтва з мастацтвам народаў Расіі і свету.

**Т э м а 3. Славянскія краіны ў барацьбе за нацыянальнае вызваленне (2 г)**

**Славянскае пытанне ў XIX стагоддзі.** Палітычнае становішча славянскіх народаў у пачатку XIX ст. Польскія, беларускія і ўкраінскія землі ў складзе Расійскай імперыі. Польскія, чэшскія і славацкія землі ў складзе імперыі Габсбургаў. Балгарыя і паўднёваславянскія землі пад уладай Турцыі. Расія і славянскае пытанне. Руска-турэцкая вайна і вызваленне Балгарыі. Утварэнне славянскіх дзяржаў.

**Славянскія краіны ў канцы XIX – пачатку XX ст.** Балгарскае царства. Балканскі саюз. Балканскія войны. Становішча польскіх земляў у складзе Расіі, Аўстра-Венгрыі і Германіі. Барацьба за нацыянальную самабытнасць. Чэшскія землі і Славакія ў складзе Аўстра-Венгрыі. Барацьба за нацыянальнае адраджэнне. Нацыянальны і рэлігійны склад насельніцтва паўднёваславянскіх земляў. Рух за дзяржаўную самастойнасць. Асаблівасці развіцця культуры славянскіх народаў.

**Т э м а 4. ЗША і Лацінская Амерыка (2 г)**

**Адзін кантынент – дзве Амерыкі.** Станаўленне незалежных лацінаамерыканскіх дзяржаў. Экспансія ЗША на кантыненце. Грамадзянская вайна ў ЗША і яе вынікі. Прычыны паскоранага эканамічнага росту ЗША. Прыток эмігрантаў і іх амерыканізацыя. Асаблівасці амерыканскай палітычнай сістэмы. Неўмяшальніцтва ЗША ў еўрапейскія справы да першай сусветнай вайны.

Матэрыяльныя і духоўныя імкненні амерыканцаў. Фарміраванне нацыянальных традыцый і звычаяў. Уолт Уітмен – пясняр амерыканскай дэмакратыі. Трывожныя перасцярогі. Дасягненні амерыканцаў у галіне культуры. Адукацыя і навука, літаратура і мастацтва. Адметныя рысы развіцця лацінаамерыканскай культуры.

**Т э м а 5. Свет Усходу і Афрыка (7 г)**

**Каланіялізм на Усходзе.** Пераход ад каланіяльнага гандлю да каланіяльнай экспансіі і тэрытарыяльных заваяванняў. Супраціўленне чужаземнаму ўмяшанню. Формы і метады каланіяльнай эксплуатацыі народаў Азіі і Афрыкі. Тэрытарыяльны падзел свету ў канцы XIX – пачатку XX ст.

**Асноўныя цэнтры антыкаланіяльнага супраціўлення.** Паўстанні на Яве, у Алжыры і Індыі пад знакам "феадальнага нацыяналізму". Англа-афганскія войны. "Опіумныя войны" і паўстанне іхэтуаней у Кітаі. Супраціўленне Эфіопіі чужаземнаму ўмяшанню. Англа-бурская вайна 1899-1902 гг.

**Сялянскія паўстанні сярэдневяковага тыпу.** Сялянская вайна тайпінаў у Кітаі і паўстанне бабідаў у Іране. Прычыны і перадумовы паўстанняў. Выступленне махдзістаў у Судане. Рэлігійна-ўраўняльны характар ідэалогіі паўстанцаў. Неадназначная ацэнка гэтых паўстанняў гісторыкамі.

**Рэфармаванне традыцыйнага ўсходняга грамадства.** Прычыны, характар і мэты рэформаў. Спробы рэформаў у Асманскай імперыі (Турцыя). Еўрапеізацыя і новаўвядзенні ў арабскіх краінах. Фарміраванне капіталістычнага ўкладу ў Індыі. Мадэрнізацыя ў Кітаі. Сацыяльныя і палітычныя вынікі рэформаў. Зараджэнне буржуазнага нацыяналізму. Змены ва ўкладзе жыцця ўсходняга грамадства.

**Феномен Японіі.** Рэвалюцыя Мэйдзі і яе вынікі. Асаблівасці прамысловага будаўніцтва ў апошняй чвэрці XIX ст. Запазычанне ў Еўропы. Рост нацыяналізму і мілітарызму. Пераўтварэнне Японіі ў вялікую дзяржаву на Далёкім Усходзе.

**Рэвалюцыйны ўздым у пачатку XX ст.** Прычыны і перадумовы рэвалюцыйнага ўздыму. Пранікненне ў краіны Усходу ліберальна-буржуазных і сацыялістычных ідэй. Утварэнне першых палітычных партый і арганізацый. Нацыянальны кангрэс у Індыі. Дзейнасць Гандзі і Сунь Ятсена. Уздым нацыянальнага руху ў Індыі. Рэвалюцыі ў Іране і Турцыі. Звяржэнне Цынскай дынастыі ў Кітаі.

**Духоўнае жыццё і культура.** Рэлігійная і філасофская думка. Прыстасаванне рэлігіі да новых умоў. Рэфарматарскія рухі сярод індусаў і мусульман. Аль-Афгані.

Духоўны вопыт Рамакрышны і Вівекананды ў Індыі.

Новыя павевы ў культурным жыцці. Нацыянальныя і рэлігійныя асаблівасці ў развіцці літаратуры і мастацтва (Мусульманскі свет, Паўднёва-Усходняя Азія, Далёкі Усход).

Т э м а 6. Першая сусветная вайна (1 г)

**Першая сусветная вайна — рубежны перыяд у еўрапейскай гісторыі.** Еўропа і свет у пачатку XX ст. Рост нацыяналізму і шавінізму. Імперыялізм. Гаварылі пра мір, а рыхтаваліся да вайны. Пачатак сусветнай трагедыі. Ход баенных дзеянняў. Новае аблічча вайны. Нарастаючае нездавальненне вайной у еўрапейскіх краінах. Антываенныя дэманстрацыі. Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі. Уступленне ў вайну ЗША і змены ў суадносінах сіл на карысць краін Антанты. Камп'енскае перамір'е і канец вайны. Якім быць міру ў Еўропе?

**Паўторна-абагульняльны ўрок (1 г)**

## Р А З Д З Е Л II. СВЕТ У 1918-1945 ГГ. (16 Г)

### Т э м а 7. Краіны Еўропы і Амерыкі паміж дзвюма сусветнымі войнамі (1918-1939 гг.) (6 г)

**Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін і яе супярэчнасці.** Новая расстаноўка сіл на міжнароднай арэне ў выніку першай сусветнай вайны. Парыжская мірная канферэнцыя. Стварэнне Лігі Нацый. Мірныя дагаворы з Германіяй і яе саюзнікамі. Вашынгтонская канферэнцыя. Супярэчлівы характар Версальска-Вашынгтонскай сістэмы.

**Пасляваенны крызіс 1918-1923 гг.** Пашырэнне магчымасцей шматварыянтнага і альтэрнатыўнага грамадскага развіцця ва ўмовах крызісу. Буржуазна-дэмакратычныя рэвалюцыі ў Германіі і Аўстрыі. Савецкія рэспублікі ў Баварыі, Венгрыі і Славакіі. Буржуазны рэфармізм у шэрагу краін Еўропы і Лацінскай Амерыкі. Першая "фашысцкая" хваля ў Італіі і Германіі.

**Галоўныя рысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця.** Пераадоленне цяжкасцей пасляваеннага крызісу. Эканамічны ўздым 1924-1929 гг. Масавае ўкараненне передавой тэхнікі і навейшай тэхналогіі. Рост жыццёвага ўзроўню еўрапейцаў і амерыканцаў.

Сусветны эканамічны крызіс 1929-1933 гг. і яго ўплыў на краіны Захаду. Пераўтварэнне дзяржаўнага рэгулявання ў пастаянны фактар сацыяльна-эканамічнага жыцця. Умацаванне пазіцый ЗША у сусветнай капіталістычнай эканоміцы.



**Фашызм: агульныя рысы і асаблівасці развіцця ў міжваенны час.** Узнікненне фашызму. Сучасныя трактоўкі фашызму. Прычыны прыходу фашыстаў да ўлады. Сацыяльная база фашызму і яго характэрныя рысы: таталітарызм, нацыяналізм, правадырства. Унутраная і знешняя палітыка фашысцкіх рэжымаў. Супраціўленне фашызму. Народныя франты ў Францыі і Іспаніі.

**Рабочы рух, сацыял-дэмакратыя і Камуністычны Інтэрнацыянал.** Арганізацыйны раскол рабочага руху. Аднаўленне II і ўтварэнне III Камуністычнага Інтэрнацыянала. Спад рабочага руху. Уключэнне сацыял-дэмакратыі ў структуру буржуазна-дэмакратычнай дзяржаўнасці. Курс на пашырэнне дэмакратычных і сацыяльных правоў і паляпшэнне матэрыяльнага дабрабыту працоўных.

Камуністычны Інтэрнацыянал: курс на "Бальшавізацыю" камуністычных партый і ўключэнне іх у барацьбу супраць капіталізму за ўстанаўленне дыктатуры пралетарыяту. Адносіны да сацыял-дэмакратыі.

Уплыў сусветнага эканамічнага крызісу 1929-1933 гг. на рабочы рух. Рост пагрозы фашызму. Сацыял-дэмакратыя і фашызм. Палітыка "меншага зла". Абарона сістэмы буржуазнай дэмакратыі. Камінтэрн і сацыял-дэмакратыя: ад канфрантацыі да саюзу ў барацьбе з фашызмам. І. В. Сталін і Камінтэрн.

**Міжнародныя адносіны ў міжваенны час.** Стабілізацыя міжнародных адносін у 1924-1929 гг. План Даўэса. Лакарнская канферэнцыя. Германскае пытанне. Нармалізацыя адносін СССР з заходнімі краінамі. Пакт Брыяна-Келага. Уплыў сусветнага эканамічнага крызісу 1929-1933 гг. на міжнародныя адносіны. Нарастанне супярэчнасцей паміж буйнымі дзяржавамі. Утварэнне ачагоў вайны.

Крушэнне Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Пачатак агрэсіўных дзеянняў фашысцкіх дзяржаў. Агрэсія Італіі супраць Эфіопіі. Умяшанне Германіі і Італіі ў іспанскія справы. Утварэнне блока агрэсіўных дзяржаў. Аншлюс Аўстрыі.

Палітыка прымірэння заходніх краін. Мюнхенская канферэнцыя. Новыя акты агрэсіі. Расчляненне і акупацыя Чэхаславакіі. Правал спроб стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе. Савецка-германскі пакт аб ненападзенні.

**Навука і культура заходніх краін у міжваенны час.** Развіццё навукі і тэхнікі. Поспехі прыродазнаўчых навук. Адкрыццё нейтрона, штучнай радыеактыўнасці. Дж. Чэдзвік, муж і жонка Кюры. Дасягненні ў іншых навуковых галінах. Псіхіятрыя, псіхааналіз. Э. Фрэйд.

Збліжэнне навукі з вытворчасцю, паступовая пераарыентацыя на спажывецкі тып матэрыяльнай культуры. Электрыфікацыя чыгуначнага транспарту. Народны

аўтамабіль. Развіццё грамадзянскай авіяцыі. Гукавое і каляровае кіно. Першыя крокі тэлебачання. Індустрыялізацыя вольнага часу.

Літаратура і мастацтва. Працяг традыцый рэалізму і псіхалагізму ў літаратуры (Л. Фейхтвангер, Дж. Галсуорсі, Дж. Б. Шоў, А. Маруа, А. Жыд, Л. Арагон). Творчыя пошукі і выкарыстанне новых выяўленчых форм (Ф. Кафка, Дж. Джойс). Працяг традыцый мадэрнізму ў мастацтве. Сюррэалізм. С. Далі. Архітэктура.

## Тэма 8. Савецкі Саюз (5 г)

**Кастрычніцкая рэвалюцыя і грамадзянская вайна ў Расіі.** Расстаноўка палітычных сіл у краіне напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі. II Усерасійскі з'езд Саветаў, яго рашэнне аб уладзе. Устанаўленне дыктатуры партыі бальшавікоў. Грамадзянская вайна. "Белы" і "чырвоны" тэрор. Ацэнка грамадзянскай вайны сучаснікамі і нашчадкамі.

**Утварэнне СССР і развіццё нацыянальных адносін.** Альтэрнатыўныя праекты ўтварэння савецкай шматнацыянальнай дзяржавы. Ідэя "аўтанамізацыі". Вялікадзяржаўны шавінізм у нацыянальнай палітыцы. Утварэнне СССР.

Канстытуцыя 1936 г. і нацыянальнае пытанне. Нацыі і народнасці. Культура нацыянальных адносін, яе асаблівасці. Месца рускай мовы ў нацыянальнай палітыцы. Рэальная практыка савецкай улады ў адносінах да нацыянальных рэспублік.

**Праблемы эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця.** Ажыццяўленне Дэкрэта аб зямлі. Узнікненне ідэалогіі і практыкі ваеннага камунізму. Натуралізацыя эканамічных адносін. Сутнасць новай эканамічнай палітыкі. Індустыялізацыя і калектывізацыя. Рост абароннай магутнасці. Застой у сельскагаспадарчай вытворчасці.

Устанаўленне ўсеўладдзя Камуністычнай партыі. Саветы, прафсаюзы, іншыя грамадскія арганізацыі ў сістэме таталітарнай дзяржавы. Палітычная барацьба "у вярхах" і "на месцы". Культ асобы Сталіна. Масавыя рэпрэсіі.

Знешняя палітыка напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Праблема стварэння калектыўнай бяспекі. Ваенныя сутыкненні з Японіяй. Савецка-германскі пакт аб ненападзенні. Вайна з Фінляндыяй.

**Асаблівасці развіцця культуры ў 20-30-х гадах.** Рэвалюцыя і пралетарская культура. Трагічны лёс расійскай інтэлігенцыі. Сутнасць культурнай рэвалюцыі. Распаўсюджанне адукацыі. Новая інтэлігенцыя. Фарміраванне сістэмы ідэалагічнай забароны. Дасягненні савецкай навукі. Літаратура і мастацтва.



## Тэма 9. Краіны Азіі і Афрыкі (3 г)

**Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча.** Узровень эканамічнага развіцця. Гаспадарчыя ўклады. Аграрнае пытанне. Асаблівасці эканамічнага развіцця краін і рэгіёнаў.

Новыя тэндэнцыі ў эканоміцы. Рост нацыянальнага капіталу. Роля замежнага капіталу. Структурныя змены ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Уплыў сусветных эканамічных крызісаў. Змены ў сацыяльнай структуры. Сацыяльная дыферэнцыяцыя. Рабочы клас, сялянства, прадпрымальнікі, сярэднія слаі. Роля інтэлігенцыі і арміі.

Палітычны лад і палітычная барацьба ў вядучых краінах Азіі і Афрыкі. Роля Японіі ў Азіі ў міжваенны перыяд.

**Нацыянальна-вызваленчы рух.** Ідэалогія нацыянальна-вызваленчага руху. Гандзізм, яго асноўныя палажэнні і прычыны ўплыву на індыйскае грамадства. Суньятсенізм як ідэалогія нацыянальнай рэвалюцыі ў Кітаі. Асаблівасці ідэалогіі і нацыянальна-патрыятычных сіл у Турцыі. Кемалізм.

Нацыяналізм, сацыялізм і іслам у вучэнні Сукарна. Ісламскі нацыяналізм. Панарабізм. Распаўсюджанне сацыялістычных ідэй. Уплыў анархізму і марксізму-ленінізму.

Дэмакратычны і рэвалюцыйны ўздым 1918-1922 гг. і яго вынікі. Нацыянальныя рэвалюцыі ў Кітаі і Турцыі. Асаблівасці нацыянальна-вызваленчага руху ў Індыі. Агульныя і адметныя рысы барацьбы народаў за нацыянальную незалежнасць у міжваенны перыяд. Стратэгія і тактыка палітычных партый. Роля народных мас. Палітыка Камінтэрна і СССР.

**Развіццё навукі і культуры.** Новыя з'явы і змены ў сістэме адукацыі. Барацьба за ліквідацыю непісьменнасці. Асноўныя праблемы і дасягненні ў галіне вышэйшай адукацыі. Навука і тэхніка.

Мастацкая культура. Літаратурнае і тэатральнае жыццё. Асноўныя тэндэнцыі развіцця. Напрамкі і школы. Асаблівасці літаратурнага працэсу на Усходзе. Уплыў Захаду і СССР. Выяўленчае мастацтва. Фарміраванне нацыянальных школ жывапісу. Агульныя і адметныя рысы мастацтва розных краін. Архітэктура і скульптура. Музычная культура. Школы і выканаўцы. Фарміраванне нацыянальнага кінамастацтва ў краінах Азіі і Афрыкі.

## Тэма 10. Другая сусветная вайна (3 г)

Пачатак другой сусветнай вайны. Прычыны і характар вайны. Напад Германіі на Польшчу. Уступленне ў вайну Англіі, Францыі і іншых краін. "Дзіўная вайна" ў Заходняй

Еўропе. Далучэнне да СССР Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны, прыбалтыйскіх краін, Паўночнай Букавіны і Бесарабіі. Савецка-фінская вайна.

Захоп Германіяй Даніі і Нарвегіі. Уварванне ў Галандыю, Бельгію і Францыю. Уступленне ў вайну Італіі. Капітуляцыя Францыі. Абарона Англіі. Вайна ў Афрыцы. Берлінскі пакт. Фашысцкая агрэсія на Балканах. Пачатак руху Супраціўлення ў акупіраваных краінах.

**Вялікая Айчынная вайна савецкага народа.** Нападзенне Германіі на СССР. Расшырэнне маштабаў другой сусветнай вайны. Бітва пад Масквой і яе значэнне. Правал "маланкавай вайны". Карэнны пералом у ходзе другой сусветнай вайны. Рашаючыя перамогі Савецкай Арміі пад Сталінградам і на Курскай дузе, саюзных войск у Афрыцы і Міжземнамор'і. Роля савецкага тылу і партызанскага руху ў барацьбе супраць захопнікаў. Пачатак распаду фашысцка-мілітарысцкага блока. Капітуляцыя Італіі. Умацаванне антыгітлераўскай кааліцыі. Тэгеранская канферэнцыя.

**Разгром агрэсіўнага блока.** Адкрыццё другога фронту ў Еўропе. Вызваленне СССР саюзнікамі ў 1944-1945 гг. ад акупантаў еўрапейскіх краін. Крымская канферэнцыя. Заснаванне ААН.

Разгром фашысцкай Германіі і яе безагаворачная капітуляцыя. Патсдамская канферэнцыя. Уступленне СССР у вайну з Японіяй. Капітуляцыя Японіі. Вынікі і ўрокі другой сусветнай вайны.

Сусветна-гістарычнае значэнне перамогі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне.

**Паўторна-абагульняльны ўрок (1 г)**

## РАЗДЗЕЛ III. КРАІНЫ СВЕТУ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX СТ. (24 Г)

### Т э м а 11. Краіны Захаду пасля другой сусветнай вайны (7 г)

**Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця.** Перыяды эканамічнага развіцця: аднаўленне, адносная стабілізацыя развіцця, запавольванне тэмпаў і новы ўздым эканомікі ў 80-я гады. Сусветныя эканамічныя крызісы і іх вынікі.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і яе роля ў паскарэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця. Фарміраванне ваеннапрамысловага комплексу. Тэхналагічнае пераасnашчэнне вытворчасці. Структурная перабудова эканомікі, бурнае развіццё яе новых галін. Стварэнне асноў эканомікі будучага XXI ст. развітымі краінамі. Пачатак і развіццё інтэграцыі ў краінах Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Народы "вялікай сямёркі".



Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і змены ў сацыяльнай структуры. Сярэдні клас. Рост агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай падрыхтоўкі насельніцтва. Размыванне мяжы паміж разумовай і фізічнай працай. Паляпшэнне ўмоў працы. Развіццё нематэрыяльнай сферы вытворчасці. Рост дабрабыту насельніцтва. Народны капіталізм. Канцэпцыя сацыяльнага партнёрства. Праблемы сацыяльнага развіцця і беспрацоўе, узровень беднасці, СНІД, наркаманія. Экалагічныя праблемы.

Удасканаленне буржуазнай дэмакратыі. Крах таталітарызму ў Грэцыі, Партугаліі, Італіі. Неакансерватыўная хваля ў палітыцы заходніх краін у 80-я гады.

**Міжнародныя грамадскія рухі.** Асноўныя тэндэнцыі развіцця міжнароднага камуністычнага руху. Размыванне сацыяльнай базы кампартый. Еўракамунізм. Крах "рэальнага сацыялізму" і міжнароднага камуністычнага руху.

Сацыялісты і сацыял-дэмакраты. Стварэнне Сацыялістычнага Інтэрнацыяналу. Курс на рэформы, дэмакратычны сацыялізм, умацаванне парламенцкай дэмакратыі. Уплыў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі на тактыку і стратэгію сацыял-дэмакратыі.

Прафсаюзны рух. Плыні ў прафсаюзным руху. Сусветная федэрацыя прафсаюзаў. Міжнародная канфедэрацыя свабодных прафсаюзаў. Сусветная канфедэрацыя працы. Галоўныя напрамкі дзейнасці прафсаюзаў. Іншыя масавыя грамадскія рухі: экалагічны, антываенны, маладзёжны і інш.

**Міжнародныя адносіны пасля другой сусветнай вайны.** Праблемы мірнага ўрэгулявання ў Еўропе. Пачатак "халоднай вайны". Фарміраванне "двухполюснай" сістэмы міжнародных адносін. Стварэнне НАТО і Арганізацыі Варшаўскага дагавора (АВД). Сапернiцтва на міжнароднай арэне паміж СССР і ЗША. Карыбскі крызіс. Агрэсія ЗША у Індакітаі. Вайна на Блізкім Усходзе.

Разрадка міжнароднай напружанасці. Дасягненне ваенна-стратэгічнага парытэту паміж СССР і ЗША. Нарада па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Новы віток "халоднай вайны" ў канцы 70-х – першай палове 80-х гадоў. Узмацненне гонкі ўзбраенняў і пагрозы міру ва ўсім свеце. Неабходнасць выйсця з тупіка. Новае палітычнае мысленне ў СССР. Перамены ў савецка-амерыканскіх адносінах. Канец "халоднай вайны".

Урэгуляванне знешніх аспектаў германскай еднасці. Парыжская хартыя для новай Еўропы. Роспуск Савета эканамічнай узаемадапамогі (СЭУ) і АВД. Распад СССР і яго ўплыў на міжнароднае супольніцтва.

**Развіццё навукі і культуры ў краінах Захаду ў другой палове XX ст.** Развіццё навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

Адкрыццё і мірнае выкарыстанне атамнай энергіі, асваенне блізкага космасу. Паяўленне і выкарыстанне новай тэхналогіі: камп'ютэры, лазеры, робаты, альтэрнатыўныя крыніцы энергіі, спадарожніцкая сувязь, біятэхналогія, кампазітныя матэрыялы, дасягненні ў медыцыне. Пераўтварэнне навукі ў непасрэдную вытворчую сілу. Сацыяльныя вынікі НТР.

Масавая культура. Сродкі масавай камунікацыі і іх уплыў на культуру. Стварэнне культа "зорак" – пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў, акцёраў.

Мастацкая культура. Крытычны рэалізм і неарэалізм. Новыя напрамкі ў мастацтве. Філасофія экзістэнцыялізму і мастацтва абсурду. Распаўсюджванне гіперрэалізму ў жывапісе.

## Т э м а 12. Савецкі Саюз (1945-1991 гг) (3 г)

**Тэндэнцыі і супярэчнасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця.** Надзеі і спадзяванні ў савецкім грамадстве. Аднаўленне гаспадаркі: поспехі і дыспрапорцыі. Рэформы 50-60-х гадоў. Курс на НТР. Прычыны запаволеных тэмпаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Спробы паскарэння НТР. Каманднa-адміністрацыйная эканоміка. Складванне і дзеянне механізму тармажэння. Узмацненне ўлады партыйна-дзяржаўнай бюракратыі. Асноўныя напрамкі знешнепалітычнай дзейнасці. Дасягненні і пралікі.

**Навука і культура.** Асаблівасці і праблемы развіцця культуры. Савецкая атамная праграма. Навука і космас. Дасягненні савецкай навукі і яе ўклад у развіццё сусветнай цывілізацыі. Літаратура, мастацтва і музыка. Дысідэнцкі рух і культура "самвыдата". Ажыўленне духоўнага жыцця. Адраджэнне культурна-нацыянальных традыцый. Ідэалы і каштоўнасці савецкага грамадства.

**Распад СССР.** Паглыбленне эканамічнага крызісу. Распаўсюджанне апазіцыйнага настрою. Правалы ў знешняй палітыцы. Адставанне ад краін Захаду. Перабудова: яе сутнасць і мэты. Цяжкасці і супярэчнасці перабудовы. Крах ідэалогіі і палітыкі КПСС. Нацыянальныя канфлікты (Нагорны Карабах, Малдова, Таджыкістан, Грузія, рэспублікі Балтыі).

Распад СССР як унітарнай дзяржавы і ўтварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы ў Расійскай Федэрацыі.

## Т э м а 13. Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ( 3 г)

**Праблемы выбару шляхоў развіцця.** Успрыманне савецкай мадэлі сацыялізму. Будаўніцтва асноў сацыялізму:



фарсіраваная індустрыялізацыя, паскоранае каапераванне сельскай гаспадаркі, культурная рэвалюцыя. "Самакіраўніцкі сацыялізм" у Югаславіі.

Утварэнне СЭУ. АВД.

**Крызіс савецкай мадэлі сацыялізму.** Народныя паўстанні 50-х гадоў у ГДР, Польшчы і Венгрыі. Спробы рэформаў. "Пражская вясна" 1968 г. у ЧССР. Крызіс 1968-1970 гг. у Польшчы. Супярэчлівы характар будаўніцтва "развітога сацыялізму".

**Народныя рэвалюцыі канца 80-х гадоў.** Паглыбленне крызісу таталітарных рэжымаў у 70-80-я гады. Фарміраванне новых палітычных сістэм. Пераход да рынкавай эканомікі. Цяжкасці паслярэвалюцыйнага развіцця. Распад Югаславіі, Чэхаславакіі. Аб'яднанне Германіі. Роспуск СЭУ і АВД. Пошукі новых напрамкаў знешнепалітычнага развіцця.

## Т э м а 14. Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі (6 г)

**Нацыянальна-вызваленчыя рэвалюцыі і дэкаланізацыя.** Тыпалогія нацыянальна-вызваленчых рэвалюцый. Агульныя і адметныя рысы антыімперыялістычных рэвалюцый у краінах Азіі і Афрыкі. Распад каланіяльнай сістэмы. Утварэнне незалежных дзяржаў і іх роля ў сённяшнім свеце. Палітыка СССР і Захаду. Неакаланіялізм.

**Ідэалагічныя дактрыны і плыні.** Кансерватыўныя дактрыны грамадскага развіцця. Роля рэлігій і традыцыйных каштоўнасцей. Узрастанне ўплыву іслама на грамадска-палітычнае жыццё. Ісламскі фундаменталізм. Кансерватыўныя ідэі ў Японіі, Пакістане і іншых краінах.

Ліберальна-дэмакратычныя ідэі. Уплыў лібералізму і дэмакратычных ідэй Захаду. Тэорыі "трэцяга шляху" развіцця. Сацыялістычныя ідэі. Сацыялізм і рэлігія. Канцэпцыі "нацыянальнага сацыялізму". Таталітарныя канцэпцыі сацыялізму (мааізм, кімерсенізм і інш.).

**Палітычнае развіццё краін Азіі і Афрыкі пасля заваёвы незалежнасці.** Агульныя і адметныя рысы дзяржаўнага ладу. Дэмакратычныя, аўтарытарныя і таталітарныя палітычныя рэжымы. Рэфармаванне палітычных сістэм. Партыйна-палітычная структура. Роля арміі. Фарміраванне і крах рэжымаў "сацыялістычнай арыентацыі". Усталяванне ваенна-бюракратычнай дыктатуры ў шэрагу краін Азіі і Афрыкі. Асноўныя тэндэнцыі ўнутранай і знешняй палітыкі.

**Сацыяльна-эканамічнае становішча.** Праблемы эканамічнага развіцця. Адсталасць і неабходнасць структурнай перабудовы эканомікі. Сацыяльная структура. Новыя сацыяльныя групы і слаі. Традыцыйныя і сучасныя

структуры грамадства. Навукова-тэхнічны прагрэс. Міграцыя працоўнай сілы. Асноўныя эканамічныя рэгіёны. Роля Японіі. Новыя індустрыяльныя краіны. Барацьба за новы сусветны эканамічны парадак. Праблема запазычанасці краінам Захаду і Расіі.

**Культура краін Азіі і Афрыкі.** Сучасныя сістэмы адукацыі і навукі. Мастацкая культура. Асноўныя напрамкі і школы. Праблемы нацыянальна-вызваленчай барацьбы і нацыянальнага адраджэння ў літаратуры. Выяўленчае мастацтва. Новыя тэндэнцыі і змены. Уплыў урбанізацыі і НТР на светаўспрыманне людзей і спосаб жыцця. Спрашчэнне традыцыйных абрадаў. Сучасны шлюб і сям'я. Савецкія нацыянальныя святы. Новыя віды адпачынку.

**Лацінаамерыканскі свет.** Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця. Праблемы пераадолення эканамічнай адсталасці. Знешняя запазычанасць. Уплыў НТР на Лацінскую Амерыку: мадэрнізацыя, структурная перабудова, сацыяльныя змены. Асаблівасці развіцця лацінаамерыканскай культуры.

Дыктатарскія рэжымы і іх роля ў развіцці шэрага краін кантынента. Пераход да буржуазнай дэмакратыі. Негатыўныя вынікі развіцця асобных краін на шляху сацыялізму ЗША і Лацінская Амерыка.

**Заключэнне (1 г)**

**Свет на парозе XXI ст.** Эканамічны рост без абмежаванняў. Інтэграцыйныя працэсы. Імкненні да стварэння адзінай сусветнай гаспадаркі. Неабходнасць абмежавання росту вытворчасці і патрэбнасцей.

Становішча Злучаных Штатаў у свеце. Перавага ЗША у параўнанні з іншымі краінамі. Творчы патэнцыял гэтай краіны. Адыход ад канцэпцыі дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту. Сцвярджэнне "новага сусветнага парадку" ў свеце. Небяспечныя праявы знешнепалітычнай дзейнасці ЗША.

Праяўленне універсальнага ладу жыцця. Роля гандлю і тэлебачання ў яго ўсталяванні. Узрастанне сусветнай ролі англійскай мовы. Культурны імперыялізм. Занядад традыцыйных рэлігій. Узнікненне новых рэлігійных напрамкаў, фундаменталізм і мадэрнізм. Неабходнасць звароту да духоўнасці.

АГУЛЬНАГІСТАРЫЧНЫЯ ВЕДЫ (ПАНЯЦЦІ, ПРАБЛЕМЫ, ІДЭІ)

**Асноўны змест і перыядызацыя сусветнай гісторыі XIX-XX стст.** Нераўнамернасць гістарычнага развіцця розных краін і рэгіёнаў. Прамысловая рэвалюцыя XIX ст. і яе сацыяльныя вынікі. Фарміраванне індустрыяльнага грамадства ў Еўропе і Паўночнай Амерыцы. Манапалістычны капіталізм. Пачатак мадэрнізацыі ў шэрагу краін Азіі і Афрыкі.

Галоўныя тэндэнцыі сацыяльна-палітычнага жыцця. Станаўленне нацый і дзяржаўнасці ў XIX ст. Буржуазныя рэвалюцыі і ўсталяванне дэмакратычных інстытутаў. Формы сацыяльнай барацьбы. Імперыялізм і каланіяльная палітыка еўрапейскіх дзяржаў. Этапы нацыянальна-вызваленчага руху. Распад каланіяльных імперый у Лацінскай Амерыцы. Феномен Японіі. Рэвалюцыйны ўздым у пачатку XX ст. у Расіі, краінах Азіі і Афрыкі.

Развіццё грамадска-палітычнай думкі: лібералізм, кансерватызм, марксізм. Рэлігія і рэлігійнае жыццё. Распаўсюджанне атэізму. Прыстасаванне хрысціянства і ўсходніх рэлігій да новых умоў.

Важнейшыя дасягненні сусветнай культуры XIX ст. Развіццё навукі і тэхнічны прагрэс. Перамены ў ладзе жыцця еўрапейскага грамадства. Прыкметы заняпаду духоўнай культуры.

Вайна 1914-1918 гг. як рубежны перыяд сусветнай гісторыі. Яе сацыяльныя і палітычныя вынікі. Перамены на палітычнай карце Еўропы. Узнікненне новых нацыянальных дзяржаў. Уздзеянне Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі на ход сусветнага развіцця. Уздым нацыянальнага вызваленчага руху. Асаблівасці рэвалюцыйнага і эвалюцыйнага развіцця розных краін у 20-30-я гады. Характарыстыка таталітарных рэжымаў. Ідэалогія і практыка фашызму. Супрацьстаянне паміж Захадам і Савецкім Саюзам. Праблемы "вайны і міру" ў міжваенны перыяд.

Прычыны і характар другой сусветнай вайны. Сусветна-гістарычнае значэнне перамогі Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне. Роля антыгітлераўскай кааліцыі ў барацьбе супраць фашызму. Гераічныя і трагічныя ўрокі другой сусветнай вайны.

Змены на палітычнай карце свету ў другой палове XX ст. Асноўныя рысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краін з рознымі грамадска-палітычнымі сістэмамі. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і яе вынікі. Крушэнне каланіяльнай сістэмы. Праблема выбару шляхоў развіцця краінамі Азіі і Афрыкі. Глыбокія змены ў традыцыйным грамадстве. Крызісныя і распад сацыялістычнай сістэмы.

Глабальныя праблемы чалавецтва. Асаблівасці іх праяўлення.

Праблема "вайны і міру" ў другой палове XX ст. Неабходнасць адыходу ад канцэпцыі неабмежаванага эканамічнага росту. Інтэграцыйныя працэсы і імкненне да стварэння адзінай сусветнай гаспадаркі. Небяспечныя праявы нацыянальнай і этнарэлігійнай варожасці. Узнікненне рэлігійнага фундаменталізму. Развіццё сусветнай культуры. Крызісныя праявы ў духоўным жыцці чалавецтва.

*XI КЛАС*

**34 г (у тым ліку 3 г – рэзервовы час)**

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ. КАНЕЦ XVIII-XX СТ.

**Уводзіны (1 г).** Перыядызацыя Айчыннай гісторыі канца XVIII-XX ст. Структура дапаможніка. Асноўныя крыніцы і даследаванні. Гістарыяграфічныя канцэпцыі. Айчынная гісторыя ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі.

### РАЗДЗЕЛ I. НА ЗЫХОДЗЕ ПРЫГОННІЦКАЙ ЭПОХІ (КАНЕЦ XVIII – 50-Я ГАДЫ XIX СТ.) (7 г)

**Паўторна-ўводная тэма. Свет і Беларусь у першы перыяд Новага часу (1 г)**

Шляхі пераходу ад феадальнага да буржуазнага грамадства. Ідэі асветнікаў і іх рэалізацыя ў Канстытуцыях ЗША і Францыі. Уплыў Асветніцтва ў Рэчы Паспалітай і Расіі. Далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі. Ацэнка гэтай падзеі ў гістарыяграфіі.

**Тэма 1. Палітычнае становішча Беларусі ( 2 г)**

Змены ў палітычным становішчы насельніцтва беларускіх зямель. Тэрытарыяльна-адміністрацыйныя падзелы. Органы мясцовага дзяржаўнага кіравання. Сістэма кіравання ў гарадах. Сацыяльная і канфесійная палітыка царызму. Падаткі і павіннасці. Напалеонаўскія войны пачатку XIX ст. і лёс Беларусі. Страты Беларусі. Узмацненне рэакцыі пасля Венскага кангрэса.

**Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух.** Галоўныя моманты ў развіцці рэвалюцыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў краінах Заходняй і Цэнтральна-Усходняй Еўропы ў першай палове XIX ст. Рэвалюцыі пачатку 30-х і канца 40-х гадоў. Нацыянальна-вызваленчы рух славянскіх народаў. Польскія і расійскія дваранскія рэвалюцыянеры ў Беларусі. Паўстанне 1830-1831 гг. Водгукі ў Еўропе. Зараджэнне беларускага нацыянальна-культурнага руху. Асаблівасці вызваленчай барацьбы ў Беларусі.

**Тэма 2. Сацыяльна-эканамічныя адносіны. Народная гаспадарка (2 г)**

**Сельская гаспадарка. Памешчыкі і сяляне.** Шляхі і формы развіцця сельскай гаспадаркі ў краінах Захаду і Цэнтральна-Усходняй Еўропы ў першай палове XIX ст. Развіццё памешчыцкай гаспадаркі ў Беларусі. Землекарыстанне і павіннасці сялян. Узмацненне феадальна-прыгонніцкага ўціску. Паўперызацыя сялян. Барацьба сялян супраць прыгонніцкага ўціску. Крызіс феадальна-прыгонніцкіх адносін.



**Прамысловасць. Шляхі зносін. Гандаль. Гарады.** Дасягненні прамысловай рэвалюцыі ў краінах Захаду. Вотчынная і гарадская прамысловаць у Беларусі. Шляхі зносін і гандаль. Зараджэнне капіталістычных адносін. Колькасць, саслоўны і канфесійны склад, павіннасці гарадскога насельніцтва. Сацыяльна-эканамічны ўзровень Беларусі на фоне краін Еўропы.

**Тэма 3. Культура Беларусі (2 г)**

**Асвета і навука.** Важнейшыя дасягненні ў развіцці народнай адукацыі, навукі і тэхнікі ў краінах Захаду і ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Славяназнаўства і нацыянальна-культурнае адраджэнне славянскіх народаў. Стан адукацыі ў Беларусі. Вышэйшыя навучальныя ўстановы. Друк. Бібліятэкі. Развіццё беларусістыкі.

**Фальклор. Літаратура і мастацтва.** Віды і жанры фальклору, абрады, звычаі, лад жыцця і нормы народнай маралі беларусаў. Звесткі пра побыт і народную культуру мясцовага яўрэйскага і татарскага насельніцтва. Польскамоўная "краёвая" літаратура. Станаўленне беларускай літаратуры і літаратурнай (нацыянальнай) мовы. Тэатр, музыка, выяўленчае мастацтва, архітэктура.

Наш край у канцы XVIII – 50-я гады XIX ст.

### РАЗДЗЕЛ II. ПЕРАХОД ДА РЫНКАВАЙ ГАСПАДАРКІ. БАРАЦЬБА ЗА ДЭМАКРАТЫЮ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ (60-Я ГАДЫ XIX СТ. – 1917 Г.) (8 г)

**Тэма 4. Развіццё капіталізму і фарміраванне класаў буржуазнага грамадства (3 г)**

**Асаблівасці буржуазных рэформаў у Беларусі.** Змены ў дзяржаўна-палітычным ладзе ў краінах Захаду ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Сацыяльныя заваёвы працоўных. Вынікі буржуазных рэформаў і контррэформаў 60–90-х гадоў у Беларусі. Выключныя законы ў дачыненні да палякаў, яўрэяў, беларусаў-каталікоў.

Палітычныя рэформы, выкліканыя рэвалюцыяй 1905-1907 гг. Аграрная і земская рэформы. Барацьба з беларускім нацыянальным рухам. Дыктатура ваеншчыны ў час першай сусветнай вайны.

**Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.** "Прускі" і "амерыканскі" шляхі развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Станаўленне прадпрымальніцкай памешчыцкай гаспадаркі капіталістычнага тыпу ў Беларусі. Фарміраванне аграрнай буржуазіі. Уплыў сусветнага аграрнага крызіса на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі Беларусі. Феадальна-прыгонніцкія перажыткі. Эканамічныя вынікі сталыпінскай рэформы. Паскарэнне класавага расслаення

сялянства. Стан сельскай гаспадаркі Беларусі ў час першай сусветнай вайны.

**Прамысловая рэвалюцыя.** Урбанізацыя. Дасягненні прамысловай рэвалюцыі на Захадзе ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Асаблівасці пераходу ад ручной да машыннай вытворчасці ў прамысловасці Беларусі. Развіццё транспарту. Асноўныя напрамкі гандлёвых сувязяў. Прамысловасць, транспарт і гандаль Беларусі ў час першай сусветнай вайны. Рост гарадоў. Фарміраванне класаў буржуазнага грамадства. Спецыфіка рассялення, занятка ў і сацыяльнай структуры беларускага, рускага, польскага і яўрэйскага насельніцтва.

**Т э м а 5. Грамадска-палітычны рух (3 г)**

**Вызваленчая барацьба ў 60-я гады XIX ст. – першыя гады XX ст.** Рабочы, сацыялістычны і нацыянальна-вызваленчы рухі ў краінах Захаду і Цэнтральна-Усходняй Еўропы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Паўстанне 1863-1864 гг. у Польшчы, Літве і на Беларусі. Рух салідарнасці з паўстаннем у іншых краінах. Гісторыкі аб паўстанні. Характар, дынаміка і формы сялянскага і рабочага руху. Народніцкія і сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Ідэйна-арганізацыйнае самавызначэнне беларускага нацыянальнага руху. Польскі і яўрэйскі нацыянальныя рухі ў Беларусі.

**Грамадска-палітычная барацьба ў 1905-1914 гг.** Тры лагеры ў палітычнай барацьбе. Іх класавы і партыйны склад, праграмы і мэты. Дынаміка і формы вызваленчага руху ў перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг. Вядучая роля рабочых. Парламенцкая барацьба. Нацыянальныя рухі. Значэнне рэвалюцыі.

Становішча ў дэмакратычным лагеры пасля Трэцячэрвеньскага дзяржаўнага перавароту. Дзейнасць "западнороссов". Беларускі нацыянальна-культурны рух. Важнейшыя асаблівасці вызваленчага руху ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.

**Становішча ў Беларусі ў гады першай сусветнай вайны.** Уплыў першай сусветнай вайны на сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча ў краінах Еўропы. Паражэнні расійскага войска ў кампаніі 1915 г. Захоп немцамі Заходняй Беларусі. Рэквізіцыі. Ваенныя павіннасці. Харчовы крызіс. Рост антываенных і антыўрадавых настрояў. Рабочы і сялянскі рух. Пачатак разлажэння ў войску.

**Лютаўская рэвалюцыя.** Усталяванне двоеўладдзя. Пазіцыі Часовага ўрада, галоўных палітычных партый і плыняў па пытаннях аб вайне і міры, харчовым, аграрным



і нацыянальным. Палярызацыя грамадска-палітычных сіл. Курс бальшавікоў-ленінцаў на сацыялістычную рэвалюцыю. Уздым беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй і Усходняй Беларусі. Пытанне аб дзяржаўнасці Беларусі.

**Т э м а 6. Культура Беларусі ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. (2 г)**

**Народная адукацыя. Навука. Друк.** Асноўныя дасягненні і тэндэнцыі ў развіцці еўрапейскай культуры ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Змены ў сістэме народнай адукацыі ў Беларусі. Гістарычныя, этнаграфічныя, мовазнаўчыя і краязнаўчыя даследаванні. Публікацыі беларускага фальклору і гістарычных крыніц. Развіццё перыядычнага і кніжнага друку. Грамадская думка.

**Літаратура. Тэатр. Выяўленчае мастацтва і архітэктура.** Уплыў расійскай, польскай і ўкраінскай літаратуры і тэатральнай культуры ў Беларусі. Развіццё беларускай літаратуры і мовы. Станаўленне нацыянальнага прафесійнага тэатра. Выяўленчае мастацтва. Выдатныя помнікі архітэктуры Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. З'яўленне фота- і кінамастацтва. Водгукі на беларускае адраджэнне ў славянскіх і іншых краінах.

Наш край у 60-я гады XIX ст. – 1917 г.

**Паўторна-абагульняльны ўрок**

## РАЗДЗЕЛ III. БЕЛАРУСЬ 1917-1945 ГГ. (8 г)

**Т э м а 7. Кастрычніцкая рэвалюцыя і грамадзянская вайна на Беларусі. Утварэнне БССР (2 г)**

Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча ў краінах Антанты і Траістага саюза ў другой палове 1917 г. Абвастрэнне сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызіса ў Расіі. Кастрычніцкая рэвалюцыя. Усталяванне савецка-бальшавіцкай улады ў Беларусі. Паварот ад дэмакратыі да аднапартыйнай бальшавіцкай дыктатуры. Ваенны камунізм. Разгортванне грамадзянскай вайны.

Станаўленне незалежных дзяржаў у Польшчы, Прыбалтыцы і на Украіне. Іх пазіцыі па беларускім пытанні. Усебеларускі кангрэс і яго вынікі. Брэсцкі мір і Беларусь. Абвяшчэнне БНР і дзейнасць яе ўрада. Пазіцыі бальшавікоў па беларускім пытанні.

Адступленне германскіх войск з Беларусі. Беларускае пытанне ў час афармлення Версальскай сістэмы. Абвяшчэнне БССР і Літоўска-Беларускай ССР. Барацьба з польскай інтэрвенцыяй. Раскол Рады БНР. Аднаўленне БССР. Антысавецкія паўстанні. Рыжскі мірны дагавор Расіі з Польшчай. Падзел Беларусі. Беларуская эміграцыя.

Вынікі і цана барацьбы. Адметныя рысы масавай грамадзянскай свядомасці таго часу.

### Т э м а 8. Савецкая Беларусь у 20 – 30-я гады (2 г)

Тэрыторыя і насельніцтва БССР у пачатку 20-х гадоў. Нацыянальныя меншасці. Пераход да нэпа. Статус БССР у складзе СССР. Вяртанне БССР часткі ўсходнебеларускіх земляў. Палітыка беларусізацыі. Здабыткі нацыянальна-культурнага развіцця ў 20-я гады. Згортванне нэпа. Індустрыялізацыя за кошт сялянства.

Устанаўленне адзінай дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Размеркавальная сістэма. Вынікі калектывізацыі. Масавыя рэпрэсіі супраць інтэлігенцыі, сялянства, рабочых і вайскоўцаў. Трагічны лёс рээмігрантаў.

Адукацыя, навука, літаратура і мастацтва ў 30-я гады. Ваяўнічы атэізм. Насаджэнне "пралетарскай", "сацыялістычнай" культуры і маралі. Побыт працоўных у вёсцы і ў горадзе. Тыповыя рысы масавай свядомасці. Параўнанне з асноўнымі тэндэнцыямі ў развіцці культуры дэмакратычных і таталітарных дзяржаў Заходняй і Цэнтральна-Усходняй Еўропы.

### Т э м а 9. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы (2 г)

Сацыяльна-эканамічнае становішча ў краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы ў 20-я гады. Узмацненне тэндэнцыі да ўсталявання таталітарных рэжымаў. Канстытуцыя адноўленай Польшчы.

Заходняя Беларусь у складзе Польшчы: тэрыторыя, насельніцтва, тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел, органы кіравання. Каланіяльная палітыка польскіх улад. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Становішча сялян і рабочых. Нацыянальна-культурны ўціск. Міграцыя беларусаў у краіны Захаду.

Нацыянальна-вызваленчы, сялянскі і рабочы рух. Беларускія паслы ў польскім сейме. Палітычныя партыі і арганізацыі. Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ) і КПЗБ. Уплыў Камінтэрна на развіццё вызваленчага руху. Рэпрэсіі ў канцы 20-х і ў 30-я гады.

Заходнебеларуская культура ў 20-30-я гады. Школы, друк, літаратура і мастацтва. Гістарычныя і этнаграфічныя даследаванні. Народная культура. Быт і звычаі. Фальклор. Роля праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла. Уплыў савецкай, польскай і сусветнай культуры. Менталітэт заходнебеларускага насельніцтва.

### Т э м а 10. Беларусь у гады другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны (3 г)

Абвастрэнне супярэчнасцей паміж еўрапейскімі краінамі ў канцы 30-х гадоў. Савецка-германскі дагавор 1939 г. і пачатак другой сусветнай вайны. Уступленне Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Аб'яднанне беларускага народа ў складзе БССР. Усталяванне савецкай сістэмы ўлады і перабудова эканомікі. Змены ў становішчы насельніцтва. Палітыка ў галіне адукацыі і культуры. Палітычныя рэпрэсіі. Перадача Віленскага краю Літве.

Беларусь напярэдадні нападу гітлераўскай Германіі. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Планы фашыстаў у дачыненні да Беларусі. Захоп Беларусі гітлераўскімі войскамі. Устанаўленне фашысцкага акупацыйнага рэжыму. Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Беларусі. Органы мясцовай улады. Палітыка акупантаў. Дзейнасць калабарантаў. Масавае вынішчэнне насельніцтва. Яўрэйскія гета.

Партызанскі рух і падпольная барацьба. Роля КПСС, КПБ. Дапамога савецкага тылу. Узаемаадносіны партызан і насельніцтва. Арганізацыйная структура савецкага партызанскага руху, яго размах і асаблівасці ў Заходняй Беларусі. Польскі партызанскі рух у Заходняй Беларусі (Армія Краёва), яго мэты і тактыка. Вызваленне Беларусі ад фашысцкіх акупантаў. Страты Беларусі ў другой сусветнай вайне. Чарговая хваля эміграцыі.

Наш край ў 1917-1945 гг.

**Паўторна-абагульняльны ўрок**

## Р А З Д З Е Л IV. БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (7 Г)

### Т э м а 11. Сацыяльна-эканамічнае развіццё (2 г)

**Народная гаспадарка Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Шляхі і метады аднаўлення эканомікі ў пасляваенныя гады ў краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы і ў СССР. Ваенныя разбурэнні ў рэспубліцы і іх пераадоленне. Аднаўленне калгасна-саўгаснай сістэмы. Курс на апераджальны рост у рэспубліцы цяжкай прамысловасці. Спробы ўздыму сельскай гаспадаркі. Завяршэнне сацыялістычных пераўтварэнняў у Заходняй Беларусі. Становішча працоўных горада і вёскі.**

**Уплыў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі на развіццё эканомікі Беларусі.** Асноўныя напрамкі і галоўныя сусветныя цэнтры НТР. Асаблівасці навукова-тэхнічнага прагрэсу ў Беларусі ва ўмовах НТР. Структура прамысловасці і напрамкі яе развіцця, уплыў ваенна-прамысловага комплексу на тэхнічны прагрэс і сацыяльныя ўмовы жыцця працоўных. Уклад Беларусі ў вывучэнне і засваенне космасу. НТР і сельская гаспадарка. Адставанне Беларусі ад сусветных дасягненняў у развіцці сучасных тэхналогій і сферы паслуг.

Сацыяльна-эканамічныя і экалагічныя праблемы НТР. Чарнобыльская катастрофа і яе першыя наступствы для Беларусі.

### Т э м а 12. Грамадска-палітычнае жыццё (2 г)

**Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 40-х – сярэдзіне 80-х гадоў.** Прынцыпы ўзаемаадносін дзяржавы, грамадства і асобы ў дэмакратычных краінах свету ў пасляваенныя гады. Палітычная сістэма ў сацыялістычным лагеры. Палітыка па нацыянальным пытанні, у галіне народнай адукацыі, у навуцы і культуры. Адносіны да царквы. Праявы крызісу савецкай палітычнай сістэмы.

**Станаўленне незалежнай Рэспублікі Беларусь.** Абвастрэнне эканамічнага і палітычнага крызісу ў СССР у другой палове 80-х гадоў, асаблівасці яго развіцця ў Беларусі. Выхад сітуацыі з-пад кантролю КПСС і КПБ. Стварэнне першых некамуністычных арганізацый і партый і іх дзейнасць.

Распад СССР і ўтварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Абвяшчэнне суверэннай Рэспублікі Беларусь. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Рэфармаванне палітычнай сістэмы. Шматпартыйнасць. Увядзенне прэзідэнцкай формы кіравання. Праблемы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Сацыяльна-эканамічнае становішча. Экалагічныя праблемы.

### Т э м а 13. Беларусь на міжнароднай арэне (1 г)

Кампетэнцыя саюзных рэспублік СССР у галіне знешняй палітыкі пасля вайны. Пасляваеннае вызначэнне межаў і тэрыторыі Беларусі. БССР у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Яе рэальны статус у садружнасці краін свету. Міжнароднае становішча і знешняя палітыка суверэннай Рэспублікі Беларусь. Гандлёва-эканамічныя, палітычныя і культурныя сувязі Беларусі з зарубежнымі краінамі на сучасным этапе.

### Т э м а 14. Культура Беларусі ( 2 г)

**Развіццё культуры і грамадска-палітычнай думкі ў 40-80-я гады.** Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці еўрапейскай і сусветнай культуры ў пасляваенныя гады.

Палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў сферы культуры ў СССР. Стан культуры ў Беларусі ў 1945-1955 гг. Галоўныя дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры, мастацтва, адукацыі і навукі ў 60-80-я гады. Абмежаванасць культурна-нацыянальнага жыцця ў Беларусі.

**Культурнае жыццё ў перыяд станаўлення суверэннай Беларусі.** Змены ў духоўным жыцці беларускага народа ў канцы 80-х – пачатку 90-х гадоў. Нацыянальна-культурнае і духоўнае адраджэнне. Станаўленне сістэмы нацыянальнай адукацыі. Навука, літаратура і мастацтва Беларусі на сучасным этапе. Вяртанне на Радзіму набыткаў культуры беларускай дыяспары.

**Наш край пасля другой сусветнай вайны.**

**Паўторна-абагульняльны ўрок**



## АГУЛЬНАГІСТАРЫЧНЫЯ ВЕДЫ (ПАНЯЦЦІ, ПРАБЛЕМЫ, ІДЭІ)

Перыядызацыя гісторыі Беларусі ў канцы XVIII-XX стагоддзя.

Палітыка царызму ў Беларусі ў канцы XVIII – 50-х гадах XIX ст.

Крызіс феадальна-прыгонніцкага ладу. Сацыяльна-эканамічны ўзровень развіцця Беларусі ў параўнанні з краінамі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы ў 50-х гадах XIX ст.

Стан асветы, навукі і культуры. Зараджэнне беларускага нацыянальна-культурнага руху. Характэрныя асаблівасці вызваленчай барацьбы ў Беларусі ў параўнанні з іншымі краінамі Еўропы.

Буржуазныя рэформы другой паловы XIX – пачатку XX ст. Рэжым выключных законаў. Меры па русіфікацыі краю ў сувязі з паўстаннем 1863-1864 гг. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.

Прамысловая рэвалюцыя і урбанізацыя. Асаблівасці гэтых працэсаў у Беларусі. Развіццё транспарту і гандлю.

Фарміраванне класаў буржуазнага грамадства. Спецыфіка сацыяльнай структуры беларускага, рускага, польскага і яўрэйскага насельніцтва Беларусі. Нацыянальны склад памешчыкаў, гандлёва-прамысловай буржуазіі і гарадскога пралетарыяту.

Грамадска-палітычны рух у другой палове XIX – пачатку XX ст. Асноўныя падзеі і заваёвы рэвалюцыі 1905-1907 гг. Тры лагеры ў палітычнай барацьбе, іх мэты і праграмы. "Заходнерусізм". Развіццё беларускага нацыянальнага руху. Яго асаблівасці ў параўнанні з іншымі нацыянальнымі рухамі славянскіх і неславянскіх народаў.

Важнейшыя зрухі ў развіцці культуры ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. Развіццё навуковых ведаў пра Беларусь і беларускі народ. Дасягненні і праблемы беларускага нацыянальнага адраджэння ў пачатку XX ст.

Трагічныя наступствы для Беларусі першай сусветнай вайны.

Асаблівасці ўсталявання савецка-бальшавіцкай улады ў Беларусі.

Падзел Беларусі па Брэсцкім мірным дагаворы паміж

Савецкай Расіяй і Германіяй. Утварэнне і дзейнасць БНР. Палітыка бальшавікоў па беларускім пытанні. Абвяшчэнне БССР і Літоўска-Беларускай ССР. Падзел Беларусі паміж Савецкай Расіяй і Польшчай па Рыжскім мірным дагаворы.

Сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Савецкай Беларусі ў 20-я гады. Нэп. Палітыка беларусізацыі.

Усталяванне таталітарнага рэжыму ў БССР. Масавыя палітычныя рэпрэсіі. Жыццёвы ўзровень народа. Стан культуры. Каланіяльная палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі. Становішча народных мас. Нацыянальна-вызваленчы, сялянскі і рабочы рух. Заходнебеларуская культура ў 20–30-я гады.

Савецка-германскі дагавор 1939 г. Нападзенне Германіі на Польшчу. Уступленне Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Аб'яднанне беларускага народа ў складзе БССР.

Захоп Беларусі гітлераўскімі войскамі. Фашыскі акупацыйны рэжым. Партызанскі рух і падпольная барацьба. Страты Беларусі ў другой сусветнай вайне.

Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця ў пасляваенныя гады. Уплыў НТР на развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту. Экалагічныя праблемы. Чарнобыльская катастрофа.

Асноўныя тэндэнцыі ў грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 40-х – сярэдзіне 80-х гадоў. Спробы рэформаў.

Сацыяльна-эканамічны і палітычны крызіс 80-х гадоў.

Асаблівасці асобных этапаў у развіцці культуры ў другой палове 40-х – сярэдзіне 80-х гадоў.

Распад СССР і ўтварэнне СНД. Абвяшчэнне суверэннай Рэспублікі Беларусь. Шматпартыйнасць у палітычным жыцці. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця на сучасным этапе. Праблемы знешняй палітыкі.

Асноўныя моманты гісторыі Беларусі канца XVIII – XX ст. у кантэксце сусветнай гісторыі.

## АСНОЎНЫЯ ЎМЕННІ ВУЧНЯЎ

Суадносіць гістарычныя падзеі і працэсы з перыядам і эпохай;

раскрываць сутнасць і сэнс гістарычных з'яў, працэсаў і паняццяў;

аналізаваць, параўноўваць, абагульняць факты мінулага і сучаснасці, кіруючыся гістарычнай навукай;

выяўляць дынаміку, тэндэнцыі, прычынна-выніковыя сувязі і ўзаемасувязь гістарычных з'яў і працэсаў;



даваць ацэнку гістарычнага значэння з'явы і дзейнасці людзей, абгрунтоўваць сваю думку;

працаваць з крыніцамі ведаў: вучэбнай літаратурай, гістарычнымі дакументамі, мемуарамі, картай, статыстычнымі матэрыяламі і г.д. (рыхтаваць зводную інфармацыю, супастаўляць дадзеныя розных крыніц, ажыццяўляць крытычны разбор);

складаць канспект, тэзісы, даклад, рэферат;

прымяняць гістарычныя веды пры аналізе розных праблем сучаснасці.